РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
16 СТУДЗЕНЯ 2025 г. ЧАЦВЕР № 9 (30397)



# «НІ АДНОЙ КАПЕЙКІ НЕЛЬГА ТРАЦІЦЬ НА ТОЕ, БЕЗ ЧАГО МЫ МОЖАМ АБЫСЦІСЯ»

Чаму Прэзідэнт зноў вярнуў Дзяржаўную інвестпраграму на дапрацоўку

(Падрабязнасці на стар. 2-3)

# РАЗВІЦЦЁ — БАЗІС НАШАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адобрыў стратэгіі ўдзелу Беларусі ў рабоце Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС) і БРІКС**



Праекты Стратэгіі ўдзелу Беларусі ў ШАС і Стратэгіі дзейнняў па рэалізацыі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь у рамках удзелу ў дзейнасці БРІКС былі прадстаўлены ўрадам на разгляд кіраўніку дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка адобрыў абодва дакументы, паведамілі ў Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі.

Нагадаем, што летам 2024 года краіна стала паўнапраўным членам сям'і ШАС, а потым аформіла і статус дзяржавы — партнёра БРІКС.

У адобранай Стратэгіі ўдзелу Беларусі ў ШАС вызначаны канцэптуальныя кірункі дзейнасці, мэты і задачы ўдзелу Беларусі ў ШАС і механізмы іх рэалізацыі на найбліжэйшую і сярэднетэрміновую перспектывы.

У Стратэгіі, якая датычыцца БРІКС, таксама вызначаны прыярытэтныя кірункі ўзаемадзеяння Беларусі з дзяржавамі-членамі і дзяржавамі — партнёрамі гэтага аб'яднання.

Абедзве стратэгіі разлічаны на пяць гадоў да 2030 года. Яны могуць быць прадоўжаны, абноўлены і перагледжаны з улікам тых ці іншых актуальных тэндэнцый.

Фактычна зацверджана дарожная карта нашага ўдзелу ў гэтых без перабольшвання глабальна значных інтэграцыйных аб'яднаннях. Беларусь, насуперак ціску і санкцыям, шукае і знаходзіць свой шлях развіцця ў супольнасці з тымі краінамі, якія супраць аднапалярнага свету і гатовыя супрацоўнічаць на прынцыпах ўзаемапавагі і ўзаемавыгады дзеля дабрабыту сваіх народаў.

СТАР. 4–5

СТАНОЎЧЫ ТРЭНД НА РЫНКУ ПРАЦЫ 10



У КУПЕЛЬ — БЯСПЕЧНА 13



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

# ГАЛАСАВАННЕ: ЗРУЧНА І БЕЗ ЭКСЦЭСАЎ

**Бюлетэні па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ужо гатовы. Учора Беларускі Дом друку пачаў іх адгрузку ў рэгіёны**

Усяго надрукавана крыху больш за 7 млн бюлетэняў. Па распрацаваным графіку яны адпраўляюцца ва ўсе куткі краіны. Пабываўшы на працэсе адгрузкі гэтай важнай прадукцыі, мы падрыхтавалі інфармацыю пра выбары, якая будзе цікавая ўсім.



## ШТО З СЯБЕ ЎЯЎЛЯЕ БЮЛЕТЭНЬ?

Па словах **сакратара ЦВК Алены БАЛДОЎСКАЙ,** бюлетэнь надрукаваны на беларускай мове, што традыцыйна для прэзідэнцкіх выбараў. На пярэднім баку у алфавітным парадку змешчаны звесткі аб кандыдатах у Прэзідэнты, таксама там размешчаны і парадак запаўнення бюлетэня. З адваротнага боку бюлетэнь мае каляровую абарону. Напярэдадні галасавання два члены ўчастковай выбарчай камісіі павінны паставіць там подпісы. У выпадку адсутнасці гэтых подпісаў бюлетэні будуць пры падліку прызнавацца несапраўднымі.

Дарэчы, калі раптам выбаршчык дапусціў памылку пры запаўненні, то ён, паведаміўшы пра гэта членам выбаркама, можа атрымаць бюлетэнь узамен сапсаванага. Праўда, толькі адзін.

## ЗАБАРОНА НА ФОТА- І ВІДЭАЗДЫМКУ

На самім бюлетэні таксама прысутнічае папярэджанне аб тым, што закон забараняе фота- і відэаздымку запоўненага бюлетэня, а таксама яго вынас за межы памяшкання для галасавання.

СТАР. 7

ISSN 1990 — 763X

# «КОЖНЫ ЎКЛАДЗЕНЫ РУБЕЛЬ МАКСІМАЛЬНУЮ АДДАЧУ»

## Чаму эканомія павінна быць аптымальнай



Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклад па праекце Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы на 2025 год». Гэта асноўны фінансавы дакумент краіны па рэалізацыі найважнейшых дзяржбудоўляў з прыцягненнем сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Дакумент ужо выносіўся на разгляд Прэзідэнту раней, але ён яго не падпісаў, паколькі патрабаваўся дэталёвы аналіз некаторых аспектаў праграмы. Таму размова кіраўніка дзяржавы з адказнымі асобамі была прынцыповай.

З 2018 года ў краіне дзейнічае інстытут дзяржаўных праграм, кожная галіна праграмуе свае расходы ў рамках пяцігадовых цыклаў. І там ёсць раздзел, прысвечаны інфраструктурным праектам ці капітальным укладанням. З гэтых штогадовых праектаў складваецца рэспубліканская і рэгіянальная інвестыцыйная праграма. Такім чынам, Дзяржаўная інвестыцыйная праграма — гэта дакумент, які закранае амаль усе сферы жыццядзейнасці краіны.

### РАЗМЕРКАВАННЕ СРОДКАЎ ПАВІННА АДПАВЯДАЦЬ РЭАЛІЯМ ЧАСУ

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз паўтарыў, што 2025 год будзе складаным, дакладна не менш складаным, чым мінулы. «Разам з тым беларускі ўрад устанаўлівае паказчыкам эфектыўнасці сваёй работы ў бягучым годзе ВУП вышэйшы за 104 %. Нядрэнна. Галоўнай крыніцай яго росту заяўлены інвестыцыі на ўзроўні амаль 108 %. Плануецца асвоіць амаль 50 млрд рублёў. Гэта прыкладна 18 % ВУП Беларусі, — прывёў лічбы кіраўнік дзяржавы. — Савет Міністраў і Адміністрацыя Прэзідэнта бачаць асноўнай мэтай выхад на парог бяспекі па інвестыцыях не ніжэйшы за 20 % ВУП. Толькі пры такім узроўні мы зможам забяспечваць рост эканомікі ў будучыні».

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся: наколькі гэта лічба абгрунтаваная? Як заўважыў беларускі лідар, структура інвестыцый па напрамках фінансавання практычна не мяняецца. Сюды ўваходзяць тры ключавыя блокі: львіную долю займаюць праекты рэальнага сектара (прыкладна 60 % усіх інвестыцый); на будаўніцтва жылля прыпадае каля 20 %; трэці блок — інжынерная, транспартная і сацыяльная інфраструктура (парадку 20 %), будаўніцтва якой — адказнасць дзяржавы. Гэтыя аб'екты фінансуюцца ў рамках Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы і гэткіх самых рэгіянальных праграм. Кансалідавана з усіх бюджэтаў на гэтыя мэты спатрэбіцца 6—6,5 млрд рублёў. У Дзяржаўную інвестыцыйную праграму ўключаны аб'екты верхняга ўзроўню на 2,2 млрд рублёў, у рэгіянальныя заяўлена больш як на 4 млрд рублёў.

**«Асноўная мэта гэтай праграмы — стварэнне і развіццё інфраструктуры краіны:** інжынернай, сацыяльнай, вытворчай і абароннай. Пры гэтым накіраванасць праграмы, размеркаванне яе сродкаў паміж абазначанымі сферамі павінны строга адпавядаць рэаліям часу. Нароўні з будаўніцтвам дарог, школ і бальніц трэба не забываць пра стварэнне сучасных вытворчасцяў, а таксама аб'ектаў, дзякуючы якім мы будзем спакойна жыць пад мірным небам. Мы акрэслілі прыярытэты», — адзначыў Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу, што, прымаючы рашэнне аб будаўніцтве сацыяльных аб'ектаў, трэба ўважліва вывучаць, ці сапраўды яны патрэбныя ў гэтай мясцовасці і ў гэты час. «Мы кожны год будуем школы. Там, дзе людзі пасяліліся, там будуем школы. Я ўжо прыводзіў прыклад: вазьміце горад-герой Мінск. У цэнтры школы пустуюць, дзіцячыя садкі ў тым ліку. Калісьці мы распрадалі гэтыя дзіцячыя садкі, таму што насельніцтва ў цэнтры старэе, у школу мала хто ходзіць, у дзіцячыя садкі — тым больш. Мы пачынаем у мікрараёнах будаваць школы і дзіцячыя садкі. Гэта што, правільна? Я ўжо казаў, лепей трэба паглядзець, можа, падвезці дзяцей у школы і садкі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Акрамя таго, па яго словах, калі школа знаходзіцца недалёка, то падвезці сваіх дзяцей у школу могуць і бацькі, тым больш што ў многіх сем'яў ёсць аўтамабілі.

**„**

**«Хаця б у гэты час, калі трэба эканоміць кожную капейку. Непапулярную рэч кажу напярэдадні выбараў. Але які папулізм можа быць? Гэта я да прыкладу кажу. Таму трэба строга глядзець: дзе дзіцячы садок трэба пабудаваць — трэба, дзе школу — трэба. Дарогі — святое, мы аб гэтым ужо казалі і многае зрабілі ў гэтым плане. Транзітная краіна, не будзе дарог — людзі перастануць сюды ездзіць, перамяшчацца праз Беларусь. Сёння ў Еўропу і назад няма дарог больш, усё праз Беларусь. Ну дык трэба разумець, што для нас гэта таксама добра: людзі едуць, вязуць грошы, працуе гандаль, купляюць тавары», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.**

— Народны экспарт. Што ў гэтым дрэннага? Людзі з задавальненнем купляюць харчаванне, адзенне, іншыя нашы тавары. Не трэба траціцца прадпрыемствам і везці кудысьці тавары. Яны з высокай дабаўленай вартасцю вывозяцца ў іншыя краіны. Не толькі ў Расію, на Усход. Таму дарогі трэба будаваць. Яны павінны быць у парадку».

### ГАСПАДАРСКІ ПАДЫХОД ДА РАЗМЕРКАВАННЯ РЭСУРСАЎ

Па словах Прэзідэнта, улічваючы важнасць бягучага года, трэба будаваць і ўводзіць аб'екты з хуткай аддачай і комплексным эфектам. Гэта электрасеткі, дарогі, сувязь. Відавочна, што іх наяўнасць дасць магчымасць прадаставіць больш вытворчых пляцовак, палепшыць лагістыку. «Увогуле, неабходны гаспадарскі падыход да размеркавання наяўных рэсурсаў. І трэба не забываць, **што экспарт сёння зноў становіцца найважнейшым элементам у нашай эканоміцы.** Вырабляем шмат, палову спажываем, палову трэба прадаць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Разам з тым ён патрабуе ад чыноўнікаў забыцца пра турыстычныя паездкі за мяжу. «Паехаў член урада, службовая асоба, губернатар, Прэзідэнт, прэм'ер — значыць, адтуль мы павінны прывезці два-тры істотныя пытанні для нашай краіны. Мы павінны за нешта зачапіцца», — запатрабаваў кіраўнік дзяржавы. У прыклад ён прывёў Аман, дзе з візітам пабывалі і прэм'ер-міністр, і Прэзідэнт. Кірункі працы там вызначаны, значыць, трэба працаваць, каб быў вынік. «Міністр замежных спраў будзе мне штомесяц дакладваць аб выніках», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, часта здараецца, калі дамоўленасці, дасягнутыя падчас замежных візітаў службовых асоб, так і застаюцца на ўзроўні слоў. У сувязі з гэтым Прэзідэнт яшчэ раз звярнуў увагу на важнасць выканальніцкай дысцыпліны. «Нічога не трэба выдумваць. Дамовіліся — трэба зрабіць», — заявіў ён.

### НЕЛЬГА ТРАЦІЦЬ ГРОШЫ ПРОСТА ТАК

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся планамі Інвестыцыйнай праграмы на 2025 год, спытаў, як расстаў-

# ПАВІНЕН ДАВАЦЬ

лены прыярытэты. «Ні адной капейкі нельга траціць на тое, без чаго мы можам абысціся. Усякія офісы, канторы і іншае — у нас гэтага хапае. Дзяржаўныя яны, для МУС, дзяржслужачых — няважна для каго. І эканомія, эканомія, эканомія», — заявіў ён. Прэзідэнт папярэдзіў, што асаблівае стаўленне будзе да Камітэта дзяржаўнага кантролю. «Ваша галоўнае пытанне — гэта грошы, бюджэт. Вось туды вы павінны ўнікаць і кантраляваць урад, міністраў — усіх, хто стаіць за гэтымі грашыма», — засярodзіў ён увагу старшыні КДК Васіля Герасімава.

Аб'ём укладанняў у інвестыцыйную праграму запланаваны на ўзроўні 6,6 мільярда рублёў — грошы немалыя. Таму Прэзідэнт пацікавіўся эфектыўнасцю інвестыцыйнай праграмы для эканомікі.

**«Калі мы па-гаспадарску, эфектыўна ўкладзём гэтыя грошы, мы атрымаем добры эфект,** ён нам патрэбен сёння. Кожны ўкладзены рубель павінен даваць максімальную аддачу», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што не мог адразу падпісаць інвестыцыйную праграму, яшчэ раз яе не прааналізаваўшы з міністрамі, віцэ-прэм'ерамі, адказнымі за яе падрыхтоўку, і прадстаўнікамі губернатарскага корпуса. Ён раскрытыкаваў Адміністрацыю Прэзідэнта за тое, што на першую нараду, прысвечаную інвестыцыйнай праграме, былі запрошаны тры чалавекі і сярод іх не было адказных віцэ-прэм'ераў, прадстаўнікоў мясцовай вертыкалі, якія спажываюць львіную долю сродкаў, прадугледжаных праграмай. Прэзідэнт заявіў, што павінна быць альтэрнатыўнае меркаванне. Таму, па яго словах, інвестыцыйная праграма не была падпісана адразу. «Думаю: давайце паглядзім, давайце па-гаспадарску падыдзем да гэтага», — адзначыў Прэзідэнт. Ён яшчэ раз зрабіў акцэнт на недапушчальнасці неабгрунтаваных затрат. «Нельга траціць грошы проста так!» — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Звяртаючыся да ўдзельнікаў нарады і да ўсіх службовых асоб, Прэзідэнт паўтарыў, што для іх на першым месцы павінна быць выканальніцкая дысцыпліна і адказнасць за рашэнні, якія прымаюцца.

**«Калі вы хочаце працаваць — працуйце. Калі вы не хочаце працаваць — скажыце. Ужо выраслі сярэдняга ўзроўню маладыя хлопцы, якія хочуць працаваць, а не спрабуюць нейкія адпіскі закідваць Прэзідэнту, — сказаў ён. — І атрымліваецца: адны збеглыя і іншыя чакаюць, калі здохне Прэзідэнт: «Вось памрэ, голас у яго не той, цяжка яму гаварыць». Ды не дачакаецеся! А іншыя сядзяць, як мышы пад венікам, і думаюць: «Пранясе». Хлопцы, не пранясе».**

## ТРЭБА ПРАЖЫЦЬ ПЯЦІГОДКУ ТАК, КАБ НЕ БЫЛО СОРАМНА ПЕРАД БУДУЧЫМІ ПАКАЛЕННЯМІ

Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз падкрэсліў, што наступны год і пяцігодка будуць няпростымі. Ён растлумачыў, што на сітуацыю ў Беларусі будзе значна ўплываць эканамічная сітуацыя ў Расіі, нашага асноўнага партнёра. Расія застанецца нашым асноўным рынкам і надалей. «Але нам трэба разумець, што на расійскім рынку будзе вельмі складана. На рынку СНД будзе не прасцей», — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы. Напрыклад, прагноз па ключавых індыкатарах развіцця ў Расіі вельмі асцярожны: рост эканомікі ў межах 1,5—2,5 працэнта, двухзначныя банкаўскія стаўкі, бюджэтны дэфіцыт, які расце (больш як 1,2 трлн рублёў). «Трэба рухацца. Трэба пражыць не толькі наступны год, але і пяцігодку, выцягнуць так, каб сорамна не было перад будучымі пакаленнямі», — арыентуе беларускі лідар.



Беларускі лідар звярнуў увагу на тое, што цяпер некаторыя зыходзяць з прынцыпу «не вазьму з бюджэту я, возьме хтосьці іншы». Ад такіх падыходаў трэба катэгарычна пазбаўляцца. «А прэм'ер з міністрам фінансаў на гэта праз пальцы глядзяць. Вось таму я не падпісаў адразу гэту інвестыцыйную праграму. Думаю: давайце паглядзім, давайце па-гаспадарску падыдзем да гэтага», — адзначыў ён. Па гэтай прычыне на даклад Прэзідэнту аб зацвярджэнні Дзяржінвестпраграмы гэтым разам быў запрошаны шырокі склад удзельнікаў, уключаючы кіраўніцтва ўрада і шэрагу міністэрстваў, Адміністрацыі Прэзідэнта, Савета Бяспекі, Камітэта дзяржаўнага кантролю, Мінскага абласнога і гарадскога выканкамаў.

Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што варта засяродзіцца на фінансаванні тых аб'ектаў і галін, якія даюць хуткую аддачу. Напрыклад, сельская гаспадарка і вытворчасць малака ў прыватнасці. «Калі ў нас малако без праблем прадаецца і малакапрадукты, дык, можа, сапраўды пабудаваць малочны цэхі, малочнатаварныя комплексы і прадаць гэта малако?» — прапанаваў ён. Кіраўнік дзяржавы заклікае ўсіх адказных на тое, што трэба паглыбляцца, трэба думаць, за кошт чаго можна атрымаць даходы, за кошт чаго можна развівацца, улічваючы сітуацыю, якая складваецца вакол краіны.

Асобна Прэзідэнт папярэдзіў людзей у пагонах: ніякіх лішніх трат не будзе, у тым ліку на будаўніцтва аб'ектаў, якія не з'яўляюцца першачарговымі. «Мы дамовіліся, што не муштра павінна быць ва Узброеных Сілах. Ва Узброеных Сілах павінны быць падрыхтаваныя ў фізічных адносінах людзі. Я для прыкладу кажу. Але калі недзе нешта трэба, вы скажыце, мы прымем рашэнне», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

## ДРОБЯЗІ ВЫЛІВАЮЦЦА Ў МІЛЬЯРДЫ

Міністр эканомікі Юрый Чабатар у сваім дакладзе расказаў, што на рэалізацыю праграмы запланавана накіраваць 2,2 мільярда рублёў. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, што істотна змянілася пасля таго, як ён першы раз адправіў праект праграмы на дапрацоўку.

Юрый Чабатар адзначыў, што інвестпраграму ўмоўна можна раздзяліць на дзве часткі. Першая — гэта мерапрыемствы, такія як меліярацыя, будаўніцтва арэнднага жылля, пагашэнне крэдытаў... Аляксандр Лукашэнка на гэта заўважыў, што па такіх кірунках, як меліярацыя і арэнднае жыллё, работа ўжо наладжана. «У мінулым годзе мы нямала ўклалі ў меліярацыю. А вы мне павінны зараз далажыць, што вы пракантралявалі, што гэтыя 100 ці 50 тысяч гектараў уведзены ў строй і яны сёння выкарыстоўваюцца», — звярнуўся Прэзідэнт да міністра эканомікі. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на яшчэ адну праблему: грошы ўкладваюцца, а кантролю за аддачу ад гэтых укладанняў няма.

Другі блок інвестпраграмы — гэта ўжо канкрэтныя аб'екты, іх 86. Сярод аб'ектаў — 22 рэспубліканскія масты і дарогі. Аляксандр Лукашэнка раскрытыкаваў адказных асоб за тое, што грошы на дарогі выдзяляюцца неахайна. У прыклад ён прывёў шчыты для абароны ад шуму, якія каштуюць нямала і не заўсёды ўзводзяцца там, дзе гэта сапраўды трэба. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што раней уздоўж дарог высаджваліся дрэвы, якія і ад снегу абаранялі, і ад шуму. І, што нямалаважна, у адрозненне ад шчытоў, паглыналі ўсе шкодныя выкіды ад дарогі. «А цяпер мы шчыты ставім, агідна глядзець», — абурыўся кіраўнік дзяржавы. Ён ужо даручаў разглядзець гэта пытанне і, дзе магчыма, замяніць шчыты на дрэвы. Але ў некаторых месцах да выканання даручэння падышлі абы збыць і высадзілі некалькі дрэўцаў... Прэзідэнт запатрабаваў, каб падобнай безгаспадарчасці ў краіне не было. «Дробязі ў краіне выліваюцца ў мільярды», — канстатаваў ён.

Юрый Чабатар далажыў, што ў рамках інвестыцыйнай праграмы запланавана будаўніцтва сацыяльных аб'ектаў. Сярод іх — раённая бальніца ў Паставах, інфекцыйная бальніца ў Віцебску, школа і паліклініка ў Астраўцы. Працягнецца будаўніцтва РНПЦ дзіцячай анкалогіі ў Бараўлянах і РНПЦ «Маці і дзіця» ў Мінску. «Будуць рэалізаваны праекты, якія маюць эканамічны эфект і здольныя забяспечыць развіццё вытворчай сферы», — адзначыў міністр.

Прэзідэнт звярнуў увагу на рацыянальны падыход у будаўніцтве медыцынскіх аб'ектаў. «Вы хочаце будаваць бальніцы. Я не магу сказаць, што нам не трэба бальніцы будаваць. Але вы вызначцеся, дзе трэба», — заявіў ён. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, варта звярнуць увагу не столькі на буйныя рэспубліканскія цэнтры, колькі на невялікія ўстановы, там праблем больш. «У нас праблема, што ФАПы ў раёнах не заўсёды працуюць, у нас чэргі ў паліклініках... Дык, можа, туды накіраваць гэтыя грошы, пачынаючы ад зарплаты і іншага, — абурыўся беларускі лідар. — Вось у чым пытанне, каб мы лічылі кожную капейку, якую затрацілі на ложак у бальніцы ці на школу». Аляксандр Лукашэнка ўдакладніў: гэта ні ў якім разе не сведчыць аб тым, што бальніцы не патрэбны. Людзі хварэюць на анкалогію, сардэчна-сасудзістыя захворванні. «Давайце туды накіроўваць грошы, каб ратаваць людзей», — прапанаваў ён. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што варта інвеставаць грошы ў вытворчасць вакцын, лекавых сродкаў — тое, у чым мае патрэбу насельніцтва. Але і спытаць за гэта трэба адпаведна.

## ТРЭБА ПАГЛЯДЗЕЦЬ, КАБ НЕ БЫЛО ПРАЗМЕРНАСЦЯЎ

Пасля даклада Юрый Чабатар расказаў журналістам, што па выніках абмеркавання Прэзідэнт адправіў праект Дзяржінвестпраграмы на 2025 год на паўторную дапрацоўку. Кіраўнік дзяржавы даручыў яшчэ больш дэталёва адпрацаваць асобныя праекты, па якіх было абмеркаванне. «Вядома, тыя праекты, якія сёння ў высокай стадыі будаўніцтва, будуць працягнуты. Трэба ўсё ж паглядзець, каб не было празмернасцяў. А па тых праектах, па якіх ужо ёсць праектная дакументацыя, але будаўніцтва яшчэ не пачата, стаіць задача паглядзець, наколькі аб'ектыўна ёсць неабходнасць у іх будаўніцтве», — адзначыў Юрый Чабатар. Асобая ўвага — на аб'екты, якія ў першую чаргу дадуць магчымасць развіцця рэальнаму сектару эканомікі: прамысловыя прадпрыемствы, аб'екты энергетычнай, электрычнай і іншай інфраструктуры. «Разам з нашымі заказчыкамі мы паглядзім, што яшчэ можна ўзмацніць, каб сапраўды наша Дзяржінвестпраграма давала развіццё краіне, — адзначыў міністр эканомікі. — Кожная дзяржаўная капейка павінна разглядацца праз прызму эфектыўнасці, і гэта патрабаванне кіраўніка дзяржавы».

Юрый Чабатар расказаў, што было зменена ў праекце праграмы, калі кіраўнік дзяржавы першы раз адправіў яго на дапрацоўку: «Мы прынцыпова паглядзелі на тыя аб'екты, будаўніцтва якіх сёння не пачата. Мы прааналізавалі і вырашылі, што сёння не час і не прыярытэт прыступаць да іх узвядзення. І мы будзем вяртацца да пытання будаваць такія аб'екты ці не праз год. Тут нічога страшнага няма, бо будаўніцтва яшчэ не пачалося і пакуль ёсць іншыя прыярытэты». Пасля таго, як Прэзідэнт другі раз адправіў праект на дапрацоўку, адказныя асобы яшчэ раз звернуць пільную ўвагу на некаторыя аб'екты.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

### У тэму

## Прынцыпы разумнасці і мэтазгоднасці павінны пераважаць

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой** расказаў журналістам, што кіраўнік дзяржавы запатрабаваў да канца студзеня яшчэ раз пераправерыць, як ідуць справы з аб'ектамі, увод якіх у эксплуатацыю запланаваны на 2025 год — наколькі рэальныя тэрміны і якія сумы можна сэканоміць на стадыі будаўніча-мантажных работ і куплі пэўных відаў абсталявання. Яшчэ адно даручэнне — праверыць спіс тых аб'ектаў, якія прапануюцца да завяршэння ў 2026 годзе — з улікам параметраў інфляцыі і грашова-крэдытнай палітыкі. Усяго размова ідзе пра больш як 80 аб'ектаў. Выконваць гэтыя даручэнні будуць і заказчыкі дзяржпраграм, куды ўключаны гэтыя аб'екты, і КДК, і Мінфін як распарадчык бюджэтных сродкаў, і аблвыканкамы, на тэрыторыі якіх рэалізоўваюцца праекты. Вынікі гэтай рэвізіі лягуць на стол Прэзідэнту.

**Старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр Турчын** у размове з журналістамі адзначыў, што большасць аб'ектаў у рэгіёне будуецца за кошт рэгіянальных праграм і ў дзяржаўнай інвестпраграме аб'ектаў для сталічнай вобласці не так шмат. Ключавы аб'ект, на які дзяржаўнай праграмай выдзелены сродкі, — хірургічны корпус Мінскай абласной бальніцы, на стварэнні якога завязаны цэлы комплекс мерапрыемстваў. Па яго словах, паколькі дзяржаўная інвестыцыйная праграма вырашае шмат пытанняў, важных для кожнага рэгіёна паасобку і для краіны ў цэлым, да яе напаўнення трэба падыходзіць удумліва.

# РАЗВІЦЦЁ — БАЗІС

## У супольнасці дзяржаў-аднадумцаў

Удзел у названых інтэграцыйных аб'яднаннях — гэта не толькі эканамічнае супрацоўніцтва, якое небеспадстаўна ставяць на першае месца. Але не менш важны і палітычны аспект. **Першы намеснік міністра замежных спраў Сяргей ЛУКАШЭВІЧ** падкрэслівае:

— У 2024 годзе Рэспубліка Беларусь стала паўнапраўным членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва і атрымала статус дзяржавы — партнёра БРІКС. Гэта — дзве найважнейшыя структуры шматпалярнай сусветнай сістэмы, якая нараджаецца, супольнасці дзяржаў-аднадумцаў, аб'яднаных агульным разуменнем глабальных працэсаў і гатовых канкрэтнымі справамі і ўласным прыкладам дэманстраваць магчымасці і перавагі раўнапраўнага супрацоўніцтва без дыктату Захаду. Такія сур'ёзныя рашэнні па міжнародным пазіцыянаванні краіны ў Беларусі ніколі не прымаліся «для галачкі». Наступным лагічным крокам стала распрацоўка двух асноўных дакументаў, якія вызначаюць задачы і канцэптуальныя кірункі дзейнасці нашай краіны ў гэтых аўтарытэтных міжнародных арганізацыях — Стратэгіі ўдзелу Рэспублікі Беларусь у Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва і Стратэгіі дзеянняў па рэалізацыі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь у рамках удзелу ў дзейнасці БРІКС.



**Даведка**

**Прыярытэтнымі кірункамі ўзаемадзеяння Беларусі з дзяржавамі — членамі і дзяржавамі — партнёрамі БРІКС вызначаны:**

- супрацоўніцтва ў сферах палітыкі і бяспекі, заснаванае на прынцыпах узаемнай павагі, непадзельнай бяспекі, гарантый краінавага развіцця без канфрантацыі і супрацьборства;
- устойлівае эканамічнае развіццё, накіраванае на захаванне і памнажэнне чалавечага патэнцыялу, забеспячэнне высокіх сацыяльных стандартаў і дастойнай якасці жыцця, укараненне інавацый і найноўшых тэхналогій;
- забеспячэнне глабальнай харчовай бяспекі, барацьба з голадам, беднасцю, наступствамі змены клімату;
- пашырэнне шматбаковага супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы.

Па словах дыпламата, наш удзел у ШАС накіраваны, у першую чаргу, на абарону дзяржаўных інтарэсаў Беларусі на шматбаковым узроўні, стварэнне спрыяльных знешніх умоў, якія забяспечваюць суверэнітэт, тэрытарыяльную цэласнасць і нацыянальную бяспеку нашай дзяржавы, садзейнічанне ўсебаковаму і збалансаванаму эканамічнаму росту, сацыяльнаму і культурнаму развіццю ў рэгіёне ў мэтах павышэння ўзроўню і паляпшэння ўмоў жыцця народаў дзяржаў — членаў ШАС. Патэнцыял ШАС будзе выкарыстаны для вырашэння агульных задач у галіне палітыкі і бяспекі, пошуку аптымальных механізмаў пашырэння эканамічнай кааперацыі, паглыблення культурна-гуманітарных сувязяў на прасторы Арганізацыі.

> *Беларусь вельмі ганарыцца тым, што стала паўнапраўным членам ШАС. І мы будзем умацоўваць шанхайскі дух арганізацыі, заснаваны на прынцыпах узаемнай павагі, роўнасці і салідарнасці. Абсалютна не сумнявайцеся, Мінск зойме годнае месца сярод прадстаўленых тут сталіц. Нам ёсць што прапанаваць па канкрэтных кірунках узаемадзеяння. У нас за спінай амаль дзесяцігадовы вопыт назіральніка ў ШАС, устойлівыя палітычныя кантакты і эканамічныя сувязі з усімі членамі Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва.*
>
> **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы ў фармаце «ШАС плюс» у Астане, 4 ліпеня 2024 года.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

БРІКС у бягучых геапалітычных умовах разглядаецца Беларуссю як унікальная міжнародная пляцоўка, якая аб'ядноўвае намаганні глабальнай большасці, накіраваныя на фарміраванне сапраўднай шматпалярнасці, роўнасці і інклюзіўнасці ў міжнародных адносінах, пошук эфектыўных спосабаў вырашэння актуальных праблем. «Мэтай удзелу Беларусі ў дзейнасці БРІКС з'яўляецца актыўнае падключэнне да работы дзейных шматбаковых механізмаў аб'яднання з улікам перспектыў яго далейшага інстытуцыйнага афармлення», — тлумачыць Сяргей Лукашэвіч перспектывы нашай краіны ў статусе дзяржавы-партнёра, падкрэсліваючы, што канчатковая задача, якую ставім перад сабой, — атрыманне паўнапраўнага членства нашай краіны ў аб'яднанні.

> *БРІКС — гэта супольнасць будучыні. Па сваім патэнцыяле яна можа наблізіць канец гісторыі дамінавання калектыўнага Захаду, які аказаўся няздольным несці адказнасць за цывілізаванае развіццё міжнародных адносін. У сілах дзяржаў — удзельніц БРІКС зрабіць так, каб рэальныя рычагі ўплыву перайшлі ў рукі прагрэсіўнай сусветнай большасці. Мы цалкам раздзяляем філасофію БРІКС. Беларусь ідзе да вас з канкрэтнымі ідэямі і праектамі, якія павінны садзейнічаць вырашэнню агульначалавечых праблем. Мы гатовы стаць актыўным удзельнікам аб'яднання.*
>
> **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на саміце БРІКС у фармаце «аутрыч/плюс» у Казані, 24 кастрычніка 2024 года.**

У цэлым, па словах прадстаўніка знешнепалітычнага ведамства, удзел Беларусі ў ШАС і БРІКС накіраваны на забеспячэнне бесперапыннага палітычнага дыялогу з краінамі Глабальнага Поўдня па актуальных праблемах глабальнай і рэгіянальнай бяспекі, садзейнічанне рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця і пабудове эканамічна самадастатковых дзяржаў.

А **Мікалай БУЗІН, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ, доктар ваенных навук, прафесар,** заўважае:

— Нам, беларусам, яшчэ трэба знайсці сваё месца ў новым шматпалярным свеце, аднак глабальны выбар мы ўжо зрабілі. Наш Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка канстатаваў: «Шматпалярнасць — мы раней баяліся гэта слова вымаўляць. А я ўпершыню яго сказаў гадоў дваццаць таму, будучы ў Кітаі: нам патрэбен шматпалярны свет. І свет да гэтага рухаецца. Дзякуй богу». Адзінства народа, паслядоўная палітыка, эканамічная моц і сапраўдны суверэнітэт — нашы асноўныя арыенціры і адначасова перавагі на гэтым шляху. А развіццё, якое з'яўляецца найважнейшым прыярытэтам ШАС і БРІКС, — базіс нашай дзяржаўнасці.

## Свабода геапалітычнага манеўру

Менавіта такую перавагу дае нашай краіне ўдзел і партнёрства ў такіх арганізацыях, як ШАС і БРІКС, лічыць **аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў (БІСД), кіраўнік Цэнтра даследаванняў ШАС і БРІКС Юрый ЯРМАЛІНСКІ.** Для такой невялікай краіны, як Беларусь, гэта вельмі важны фактар, падкрэслівае ён.

Прыняцце стратэгіі ўдзелу Беларусі ў рабоце ШАС і БРІКС — гэта заканамерны вынік чарговага этапу нашай інтэграцыі ў гэтыя аб'яднанні, адзначае аналітык. «Прыняццем гэтых дакументаў мы чарговы раз пацвярджаем нашу паслядоўную, адказную і сістэмную пазіцыю па ўзаемадзеянні з любымі міжнароднымі арганізацыямі, аб'яднаннямі, пляцоўкамі», — сказаў ён.

Прычым, на думку Юрыя Ярмалінскага, важна тое, што гэтыя дакументы не з'яўляюцца догмай. Гэта не нейкая застылая субстанцыя. «Гэта значыць, яны прадугледжваюць апгрэйд (абнаўленне і мадэрнізацыю. — **«Зв.»**) у залежнасці ад бягучай абстаноўкі, канкрэтных задач, якія будуць узнікаць, і агульнай сітуацыі на прасторы», — звярнуў увагу аналітык.

**Яго калега па БІСД аналітык Вольга ЛАЗОРКІНА** адзначае: «Ва ўмовах станаўлення новага высокаканкурэнтнага геапалітычнага асяроддзя міжнародныя рэгіянальныя аб'яднанні ператвараюцца ў важны рэсурс для падтрымання стабільнасці глабальнай сусветнай сістэмы. Аб'ектыўны гістарычны працэс вывеў на першыя пазіцыі ШАС і БРІКС. Гэтыя аб'яднанні сфарміравалі выключна запатрабаваны прынцып міждзяржаўнага ўзаемадзеяння — яны не ўвязваюць супрацоўніцтва і ўзаемную дапамогу з дадатковымі ўмовамі, не імкнуцца дыктаваць сваю волю іншым дзяржавам».

Вольга Лазоркіна падкрэсліла: «Беларусь, як і мноства іншых краін, вітае адкрыты характар ШАС і БРІКС. Гісторыя ўзаемаадносін з гэтымі аб'яднаннямі і краінамі-членамі дазволіла нашай краіне ўзяць удзел у распрацоўцы прынцыпаў, якія ляжаць у іх аснове».

Сапраўды, узаемаадносіны з краінамі-стваральнікамі аб'яднанняў у нас заўсёды былі нават больш чым сяброўскія, асабліва калі казаць пра вядучых гульцоў і ШАС, і БРІКС — Расію і Кітай. Прычым, звярнула ўвагу аналітык, падыходы і тэндэнцыі абодвух аб'яднанняў, якія на чале ўсяго ставяць раўнапраўнае развіццё, цалкам супадаюць з філасофіяй інтэграцыі і адпавядаюць прынцыпам знешняй палітыкі нашай краіны.

## Эканамічная прастора — велізарная і перспектыўная

Эканамічнае супрацоўніцтва ў рамках гэтых аб'яднанняў цяжка пераацаніць: найвялікшы ў свеце рынак з мільярдамі спажыўцоў. Знайсці сваё месца на ім — вельмі важная задача, якая ў многім і вызначае наша развіццё і незалежнасць. Нездарма Прэзідэнт Беларусі не стамляецца паўтараць: эканоміка — перш за ўсё, будзе эканоміка — не будзе вайны, будзем жыць спакойна.

**Алег ДЗЯЧЭНКА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў,** мяркуе, што ўдзел нашай краіны ў найбуйнейшых геапалітычных праектах сучаснасці — ШАС і БРІКС — з'яўляецца стратэгічна важным знешнепалітычным дасягненнем, якое ўдалося дзякуючы палітычнай волі і багатаму вопыту нашага Прэзідэнта. Гэта дазваляе не толькі ўмацаваць міжнародныя пазіцыі Беларусі, але і забяспечыць рост тавараабароту з краінамі Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі і развіццё ўзаемавыгаднага эканамічнага супрацоўніцтва з рэгіёнамі свету, якія паспяхова развіваюцца.

— Экспарт беларускай прадукцыі, у тым ліку прадуктаў харчавання і сельскагаспадарчай сыравіны, супрацоўніцтва ў сферы высокіх тэхналогій, «зялёнай эканомікі», турыстычнай індустрыі, навука, культура і адукацыя, продаж на сусветных рынках машын і агрэгатаў, выраблены на прамысловых прадпрыемствах і многае іншае — вось тыя кірункі, якія будуць забяспечаны стратэгіяй удзелу Беларусі ў рабоце ШАС і БРІКС, ухваленай Прэзідэнтам, —акцэнтуе парламентарый. — Эканамічная прастора гэтых міждзяржаўных

# НАШАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

## Даведка

**Асноўнымі задачамі ўдзелу Беларусі ў ШАС вызначаны:**

- павышэнне міжнароднага аўтарытэту Рэспублікі Беларусь як міралюбівай дзяржавы, актыўнага ўдзельніка міжнароднага супрацоўніцтва;
- прасоўванне на міжнародных пляцоўках скаардынаваных падыходаў дзяржаў-членаў, назіральнікаў і партнёраў ШАС па дыялогу;
- стварэнне непадзельнай прасторы бяспекі, сумеснае супрацьдзеянне традыцыйным і новым выклікам і пагрозам бяспецы дзяржаў-удзельніц, уключаючы экстрэмізм, тэрарызм і сепаратызм ва ўсіх праявах, незаконны абарот наркотыкаў і зброі, іншыя віды транснацыянальнай злачыннай дзейнасці, незаконную міграцыю, выклікі ў кіберпрасторы і іншыя;
- паглыбленне практычнага гандлёва-эканамічнага, фінансавага і інвестыцыйнага ўзаемадзеяння, а таксама сумеснай праектнай дзейнасці ў рамках ШАС;
- пашырэнне культурна-гуманітарнага супрацоўніцтва, у тым ліку ў сферах навукі, тэхнікі і тэхналогій, адукацыі, аховы здароўя, спорту, аховы навакольнага асяроддзя.

Канкрэтныя ініцыятывы Рэспублікі Беларусь у ШАС будуць арыентаваны на рэалізацыю знешнепалітычных і знешнеэканамічных інтарэсаў нашай краіны.



аб'яднанняў велізарная і перспектыўная. Мы зможам забяспечыць не толькі рост нацыянальнай эканомікі, але і заняць годнае месца ў міжнародным раздзяленні працы і ў пабудове шматпалярнага свету. Акрамя таго, для нас важна істотна павысіць ваенна-палітычную бяспеку беларускай дзяржавы, стварыць разам з новымі саюзнікамі надзейную сістэму калектыўнай абароны нацыянальных інтарэсаў нашых краін, асабліва ў сучасных умовах геапалітычнага перадзелу свету.

### Эфектыўная «пяцёрка»

Калі казаць аб удзеле ў інтэграцыйных аб'яднаннях дзеля развіцця, бяспекі і дабрабыту, нельга пакінуць па-за кадрам Еўразійскі эканамічны саюз, у якім наша краіна прымае самы актыўны ўдзел і сёлета старшынствуе. Дарэчы, у звароце Аляксандра Лукашэнкі ў якасці старшыні Вышэйшага эканамічнага савета кіраўнікам дзяржаў — членаў ЕАЭС вышэйназваныя інтэграцыйныя аб'яднанні пазначаны сярод галоўных прыярытэтаў нашага старшынства: «Асаблівая ўвага павінна ўдзяляцца практычным аспектам спалучэння інтэграцыйных патэнцыялаў ЕАЭС, СНД, ШАС і БРІКС».

> *За мінулае дзесяцігоддзе наш Саюз здолеў даказаць слушнасць ідэі цеснай эканамічнай інтэграцыі, сваю жыццяздольнасць і выніковасць. Сумеснымі намаганнямі мы нарасцілі патэнцыял макраэканамічнай устойлівасці і мінімізавалі ўплыў негатыўных геапалітычных фактараў.*
>
> **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў звароце да кіраўнікоў — удзельнікаў ЕАЭС, 1 студзеня 2025 г.**

За 10 гадоў існавання ЕАЭС сукупны ВУП удзельніц вырас на 12,5 %. Аб гэтым паведаміў **намеснік прэм'ер-міністра, член калегіі ЕЭК ад Беларусі Ігар ПЕТРЫШЭНКА,** каментуючы старшынства нашай краіны ў 2025-м у Еўразійскім эканамічным саюзе. Прычым па выніках мінулага года (згодна з папярэднімі данымі) рост складзе 4,1 %. Што датычыцца прагнозаў на 2025—2026 гады, рост ВУП плануецца ў памеры 3,3—3,5 %.

— Будзем імкнуцца, каб гэтыя лічбы рэалізаваліся, — падкрэсліў Ігар Петрышэнка і прывёў цікавыя факты. — Узаемны гандаль краін ЕАЭС за 10-гадовы перыяд вырас у два разы. Гандаль Еўразійскага саюза з трэцімі краінамі, так званы знешні гандаль, вырас больш чым на 60 %. Гэтыя лічбы самі па сабе сведчаць аб тым, што саюз адбыўся, ён выгадны ўсім краінам-удзельніцам, асабліва нашай краіне, якая заўсёды з'яўляецца актыўным праваднікам інтэграцыйных ідэй на Еўразійскай эканамічнай прасторы. І, больш за тое, па прамысловым патэнцыяле рост склаў 22 % — гэта важна для нашай прамысловасці. Для таго каб падтрымаць гэтыя станоўчыя тэндэнцыі, замацаваць іх і вызначыць пункты росту далейшага развіцця нашага Саюза, на гэта ўсё накіравана праграма старшынства нашай краіны, якую адобрыў кіраўнік дзяржавы.




Намеснік прэм'ер-міністра нагадаў, што 1 студзеня 2025 года Прэзідэнт Беларусі накіраваў адпаведны зварот да кіраўнікоў дзяржаў Еўразійскага эканамічнага саюза, дзе выклаў і акцэнтаваў увагу на асноўных элементах нашых ініцыятыў і падыходаў:

— Прэзідэнт акцэнтаваў увагу, што нам трэба пастарацца рэалізаваць у поўнай меры тую стратэгію, якую мы прымалі і якая дзейнічае на працягу пяці гадоў. Наступны кірунак — паступова забяспечваць развіццё дэкларацыі «Еўразійскі эканамічны шлях», якая прадугледжвае далейшае развіццё нашага Саюза да 2030 года, прагляд перспектывы і пэўных кірункаў развіцця Саюза да 2045 года. Таму асноўныя кірункі нашага старшынства датычацца кааперацыйнага ўзаемадзеяння, нарошчвання тэхналагічнага патэнцыялу, пытанняў мікраэлектронікі, кааперацыйных узаемадзеянняў, гэта значыць, стварэння так званага прамысловага базісу ў Еўразійскім эканамічным саюзе з задзейнічаннем усіх інструментаў.

Ігар Петрышэнка расказаў, што фінансавы інструмент для іх рэалізацыі таксама быў падрыхтаваны:

— Ініцыяваны і прыняты па ініцыятыве беларускага боку — я маю на ўвазе дзесяціпрацэнтнае адлічэнне ад антыдэмпінгавых пошлін для падтрымкі кааперацыйных праектаў.

Віцэ-прэм'ер акцэнтаваў увагу на тым, што адным з элементаў праграмы старшынства Беларусі ў ЕАЭС з'яўляецца рост дабрабыту насельніцтва:

— Вядома ж, уся інтэграцыя накіравана на тое, каб забяспечыць павышэнне дабрабыту людзей, — падкрэсліў Ігар Петрышэнка. — Таму мы акцэнтавалі ўвагу, што будзем актыўна развіваць узаемадзеянне ў сферы аховы здароўя (а для нас гэта таксама важны элемент). Мы сутыкнуліся ў перыяд пандэміі, калі сканцэнтраваліся і забяспечвалі сябе адпаведнымі медпрэпаратамі, сродкамі абароны. Гэта значыць, у нас ёсць пэўны вопыт, і нам трэба ў далейшым развіваць гэтыя кірункі для таго, каб на прасторы Еўразійскага саюза функцыянаваў нармальны, запатрабаваны рынак лекавых сродкаў і людзі казалі, што гэта перавага нашага Саюза.

Працягваючы тэму ўзаемадзеяння ў сацыяльнай сферы, намеснік прэм'ер-міністра адзначыў, што пытанні супрацоўніцтва ў сферах адукацыі, турызму, спорту, культуры таксама вельмі важныя:

— Па гэтых усіх кірунках супрацоўніцтва развівалася, але мы маем намер яго яшчэ раз рэльефна акцэнтаваць у кантэксце тых задач, якія вырашае Еўразійскі эканамічны саюз.

Ён нагадаў, што ў рамках старшынства Беларусі Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка запрасіў усіх кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц ЕАЭС у Мінск на чарговае пасяджэнне, правядзенне якога запланавана на май.

Варта сказаць, што за 10 гадоў існавання «пяцёркі» (куды акрамя нашай краіны ўваходзяць Расія, Казахстан, Кыргызстан і Арменія) выбудавана паспяховая інтэграцыйная мадэль узаемадзеяння ў шматбаковым фармаце, забяспечаны трываласць і эфектыўнасць эканамічнага аб'яднання.

У рамках саюза створаны агульныя рынкі тавараў, паслуг і працы. Сумесны фінансавы рынак — на этапе фарміравання.

Таксама адзначаецца пазітыўная дынаміка па большасці эканамічных паказчыкаў. І гэта сведчыць аб тым, што інтэграцыя рэальна працуе, дазваляючы краінам-удзельніцам годна спраўляцца са знешнімі выклікамі, забяспечваць устойлівасць эканомік, развіваць новыя кампетэнцыі ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, сферы высокіх тэхналогій.

На адным з нядаўніх пасяджэнняў Еўразійскага міжурадсавета былі прыведзены красамоўныя лічбы: так, у першым паўгоддзі сукупны ВУП краін — удзельніц ЕАЭС вырас на 4,6 працэнта. Прыкладна на столькі ж павялічылася прамысловая вытворчасць, абарот рознічнага гандлю вырас амаль на 8 працэнтаў, перавозкі пасажыраў — амаль на 7,5. Трэнд росту захоўваецца: па выніках года чакаецца перавышэнне сярэднесусветных тэмпаў развіцця.

Разам з тым узаемнай выгадай для ўдзельнікаў інтэграцыйнае аб'яднанне не абмяжоўваецца. ЕАЭС — прывабны партнёр для іншых аб'яднанняў, краін і міжнародных арганізацый. Тры краіны маюць статус дзяржавы-назіральніка. З чатырма краінамі дзейнічаюць гандлёвыя пагадненні (з В'етнамам, Іранам, Кітаем, Сербіяй). З дзясяткамі краін і многімі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі падпісаны мемарандумы аб супрацоўніцтве.

Як паведамілі ў Еўразійскай эканамічнай камісіі, на сёння дзейнічае каля 80 мемарандумаў аб супрацоўніцтве паміж ЕЭК і трэцімі бакамі.

Усё гэта яшчэ раз пацвярджае, што ЕАЭС — важны элемент архітэктуры міжнародных эканамічных адносін, і Беларусь займае ў ёй годнае месца.

ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА

# УКЛАД ВА ЎМАЦАВАННЕ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ НАРОДА

## Наталля КАЧАНАВА ўзяла ўдзел у цырымоніі адкрыцця старажытнай святыні

У Полацку ўрачыста адкрылі Спаса-Праабражэнскі храм на тэрыторыі Спаса-Ефрасіннеўскага стаўрапігіяльнага жаночага манастыра. Работы па рэстаўрацыі храма вяліся сем гадоў.



Фота БелТА.

Наталля Качанава зачытала прывітальны адрас ад Прэзідэнта.

Унікальнасць Спаса-Праабражэнскай царквы заключаецца ў тым, што яна была пабудавана пры жыцці Ефрасінні Полацкай (прыкладна ў 1120—1150 гады). У савецкія часы храм быў адзінай дзеючай у Полацку царквой. Нездарма яго называюць жамчужынай праваслаўнага свету.

Падчас шматгадовай рэстаўрацыі тут выявілі мноства фрэсак, датаваных XII стагоддзем, якія пакрываюць 90 % сцен. Над іх раскрыццём некалькі гадоў працавалі найлепшыя рэстаўратары з Беларусі і Расіі. Аднак гэта работа была няпростай: драўляныя элементы храма пад уздзеяннем неналежных кліматычных умоў значна разбурыліся. Да рэстаўрацыйных работ прыцягвалі спецыялістаў, якія дапамаглі знайсці і ліквідаваць грыбок, які знішчаў фрэскі. Цяпер для захавання фрэсак у храме створаны асаблівыя тэмпературныя ўмовы, якія рэгулююцца з дапамогай лічбавага абсталявання. Дарэчы, падчас вывучэння фрэсак было выяўлена, што полацкія насценныя малюнкі абсалютна ўнікальныя, аналагаў ім няма ні ў адной з ацалелых праваслаўных святынь XII стагоддзя.

З новага быў дададзены люк на дах, а таксама зроблены дадатковыя слыхавыя вокны. Цяпер Спаса-Праабражэнскі храм па ўнутраным напаўненні нагадвае XII стагоддзе, звонку — XIX. Але такія метамарфозы дадаюць унікальнасці і дазваляюць прасачыць усю эвалюцыю помніка архітэктуры амаль з тысячагадовай гісторыяй.

У цырымоніі ўрачыстага адкрыцця святыні ўзялі ўдзел **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА, міністр культуры Руслан ЧАРНЕЦКІ, кіраўнік Віцебшчыны Аляксандр СУБОЦІН, старшыня Полацкага райвыканкама Ігар МАРКОВІЧ, ігуменнія Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ЕЎДАКІЯ,** жыхары і госці горада.

**«Полацкая зямля — калыска дзяржаўнасці і праваслаўнай веры беларускага народа, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Менавіта тут дзевяць стагоддзяў таму была ўзведзена Спаса-Праабражэнская царква, першы камень у падмурак якой закладзены прападобнай Ефрасінняй Полацкай.**
**Манастыр стаў духоўным цэнтрам прыцягнення для паломнікаў з усяго свету. Шматвяковая гісторыя манастыра сведчыць аб сіле веры ў Бога і яго дапамозе ў добрых справах у імя Айчыны.**
**Прытрымліваючыся запаветаў продкаў захоўваць і памнажаць багацці роднай зямлі, мы ажыццявілі сур'ёзную рэстаўрацыю храма з выкарыстаннем унікальных тэхналогій і методык, якія дазволілі аднавіць найстаражытнейшыя элементы царквы.**
**Высокай ацэнкі заслугоўвае праца будаўнікоў, навукоўцаў, рэстаўратараў і ўсіх, хто працаваў у гэтым святым месцы. Дзякуючы рэалізацыі такіх праектаў уносіцца істотны ўклад у нашу агульную справу — умацаванне гістарычнай**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# «НАША АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА — ПАВЫШЭННЕ ДАБРАБЫТУ

## Падрабязнасці сустрэчы Ігара СЕРГЯЕНКІ з працоўным калектывам МТС

Старшыня Палаты прадстаўнікоў сустрэўся з работнікамі СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы». Насычаная размова аб электаральнай кампаніі, дасягненнях краіны за апошнія 30 гадоў, а таксама аб кірунках дзейнасці Палаты прадстаўнікоў нікога не пакінула абыякавым. Супрацоўнікі прадпрыемства задавалі шмат пытанняў спікеру і нават дыскутавалі. Але пра ўсё па парадку.



Фота БелТА.

«Выбары — гэта важны, адказны этап для кожнай краіны, які вызначае будучы кірунак развіцця любой дзяржавы, — пачаў размову Ігар Сергяенка. — Нас часта любяць папракаць у незахаванні нейкіх універсальных працэдур, правілаў правядзення выбараў. Аднак правілы і працэдуры мы вызначаем самі. У нас ёсць Выбарчы кодэкс, у адпаведнасці з якім мы сёння і праводзім сваю выбарчую кампанію».

Гаворачы аб заканадаўчай дзейнасці, спікер адзначыў найважнейшыя з законапраектаў, прынятых на другой сесіі Палаты прадстаўнікоў восьмага склікання. Усяго за перыяд работы другой сесіі прынята 34 законапраекты, у рабоце знаходзіцца каля 20 законапраектаў, у тым ліку аб паштовай сувязі, па выканаўчай вытворчасці і шмат іншых.

Ігар Сергяенка асобна спыніўся на дасягненнях краіны за апошнія 30-годдзе: «Нам ёсць чым ганарыцца. На долю прамысловасці прыпадае каля 80 % трактароў, што выпрабляюцца ў краінах СНД, 50 % хімічных валокнаў і нітак, пятая частка халадзільнікаў і маразільнікаў. Па вытворчасці вялікагрузных аўтамабіляў мы займаем адно з вядучых месцаў у свеце. У цэлым, наш прамысловы комплекс фарміруе 80 % экспарту». Гаворачы аб развіцці сельскай гаспадаркі, Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў, што рост вытворчасці сельгаспрадукцыі за 24 гады павялічыўся фактычна ў два разы: Беларусь уваходзіць у пяцёрку найбуйнейшых вытворцаў малочнай прадукцыі а таксама ў топ-15 экспарцёраў мясной прадукцыі. Энергетычны комплекс сёння забяспечвае фактычна стапрацэнтны доступ да электраэнергіі, а яе спажыванне насельніцтвам цалкам забяспечваецца за кошт работы атамнай электрастанцыі; значны аб'ём работ праведзены і па газіфікацыі населеных пунктаў.

Ігар Сергяенка падкрэсліў, што рост эканомікі дазваляе развіваць і забяспечваць сацыяльную сферу.

**«Беларусь — сацыяльна арыентаваная дзяржава. Наша асноўная задача — павышэнне дабрабыту людзей, забеспячэнне роўных магчымасцяў і для аховы здароўя, і для атрымання адукацыі. У гэтым плане прыняты шэраг мер і рашэнняў. У нас бясплатная адукацыя і бясплатная медыцына. І гэта ўсё — за кошт дзяржавы.**
**Але мы гэта ўсё ўспрымаем, вядома ж, як наша дасягненне і штодзённасць. За 30 гадоў Прэзідэнцкай рэспублікі пабудавана 923 новыя аб'екты ў сферы аховы здароўя: ад карпусоў РНПЦ да раённых бальніц, іх рамонту і абсталявання матэрыяльна-тэхнічнай базы», — зазначыў спікер.**

Спыніўся ён і на жыллёвай палітыцы, адзначыўшы яе паслядоўную рэалізацыю і ролю дзяржаўнай падтрымкі пры будаўніцтве жылля.

Падагульняючы ўсё вышэйсказанае, Ігар Сергяенка адзначыў наступнае:

**«Я расказваю гэта ўсё для таго, каб паказаць, якая маштабная работа была праведзена за 30 гадоў суверэннай Беларусі. Яна працягваецца і сёння. Апошнія прыклады, якія ва ўсіх на слыху, —**

**памяці беларускага народа. Упэўнены, што шанаванне хрысціянскіх каштоўнасцяў будзе і надалей дапамагаць у захаванні культурнай спадчыны, стварэнні пасяховай будучыні для нашых нашчадкаў».**

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава дадала, што захаванне такіх святынь з'яўляецца пытаннем нацыянальнага гонару. «Гэтыя работы пачаліся дзякуючы даручэнню нашага Прэзідэнта і пры фінансавай падтрымцы дзяржавы. І гэта было ўсё няпроста, але Прэзідэнт разумеў, што гэта трэба зрабіць на карысць праваслаўя і нашага народа. Усе работы былі выкананы ў поўным аб'ёме», — сказала Наталля Качанава і выказала словы падзякі ўсім, хто руліўся над аднаўленнем храма.

Падзячны малебен у гонар адкрыцця царквы ў манастыры правёў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. «Для верніка пачуццё глыбокага трапятання выклікае дакрананне да гісторыі папярэдніх пакаленняў, да таго, да чаго дакраналася рука прападобнай Ефрасінні, бо яна сама кіравала працэсам будаўніцтва і роспісу храма. І ёсць упэўненае меркаванне, што многія надпісы на скрутках, якія намаляваны на абразах, — гэта словы, запісаныя прападобнай Ефрасінняй Полацкай. Яна не пакінула нам сваіх пісьмовых настаўленняў, наказаў, як часта бывае ад святых падзвіжнікаў, але на сценах храма ў вобразах яна захавала свае словы, думкі, якія важныя для сучаснага чалавека», — адзначыў мітрапаліт Веніямін.

У Крыжаўздвіжанскім саборы адбылася цырымонія ўзнагароджання ўсіх датычных, хто на працягу доўгіх гадоў працаваў над рэстаўрацыяй храма. У ходзе цырымоніі ордэнамі Крыжа прападобнай Ефрасінні Полацкай былі ўдастоены Наталля Качанава, **кіраўнік праекта навукова-праектнай дакументацыі «Рэстпраект» Сяргей ЛАЛАЗАРАЎ, намеснік міністра культуры Беларусі Сяргей САРАКАЧ, гендырэктар ААТ «Белрэстаўрацыя» Уладзімір ЗМУШКО.** Медалямі прападобнай Ефрасінні Полацкай былі ўзнагароджаны **дырэктар УКБ Полацка Галіна БЕЛЬСКАЯ, начальнік аддзела навукова-праектнага і метадычнага забеспячэння Міністэрства культуры Альгерд ЧАРНЯЎСКІ.**

Цяпер полацкая святыня адкрыта для вернікаў і турыстаў з усіх куткоў свету. Бягучы год для старажытнага Полацка будзе адметны яшчэ і тым, што Спаса-Ефрасіннеўскі жаночы манастыр адзначыць 900-годдзе. Культурныя і духоўна-асветніцкія праекты запланаваны па ўсёй Беларусі.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

# ЛЮДЗЕЙ»

**увод трох станцый метро. Я ўжо не кажу пра водазабеспячэнне сталіцы артэзіянскай вадой. Гэта, вядома ж, павышае якасць жыцця, камфорт, і, напэўна, нездарма Прэзідэнтам 2025-ы аб'яўлены Годам добраўпарадкавання краіны, падпісаны ўказ, у адпаведнасці з якім Саветам Міністраў распрацоўваецца канкрэтная праграма. Гэта добраўпарадкаванне датычыцца ўсяго. Яно будзе праводзіцца з удзелам усіх нас ва ўсіх населеных пунктах. І сёння мы выдатна разумеем, што краіна развіваецца дынамічна».**

Падводзячы вынікі сустрэчы, Ігар Сергяенка расказаў журналістам, што супрацоўнікі кампаніі МТС — дасведчаныя людзі ў тэхнічным плане: «Сёння яны прадэманстравалі актыўнасць у грамадска-палітычных адносінах. Пытанні датычыліся бягучай абстаноўкі, работы парламента. Асноўныя пазіцыі, якія я хацеў данесці, — расказаць аб рабоце Палаты прадстаўнікоў, аб тых законапраектах, якія мы прымалі, над якімі будзем працаваць у найбліжэйшы час. Другая асноўная задача — праінфармаваць аб бягучай абстаноўцы ў краіне, расказаць аб дасягненнях нашай краіны за 30 гадоў на канкрэтных прыкладах развіцця прамысловасці, сельскай гаспадаркі, сацыяльнай сферы, развіцця рэгіёнаў, а таксама — зрэз абстаноўкі, якая складваецца вакол Беларусі. Гэта пытанні захавання гістарычнай праўды, гістарычнай памяці».

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# ГАЛАСАВАННЕ: ЗРУЧНА І БЕЗ ЭКСЦЭСАЎ



***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Гэтыя палажэнні ўжо працавалі ў перыяд правядзення адзінага дня галасавання. Цяпер у выбарчым заканадаўстве прапісана дакладна норма, якая вызначае гэта. Падобныя дзеянні з'яўляюцца адміністрацыйным правапарушэннем і пацягнуць накладанне штрафу на таго, хто парушыў забарону, у памеры да 15 базавых велічынь, — адзначыла Алена Балдоўская.

Таксама яна дадала, што маецца на ўвазе захаванне прынцыпу тайны галасавання:

— Калі грамадзянін выстаўляе на ўсеагульны агляд тое, як ён прагаласаваў, у асноўны дзень выбараў, то гэта, па сутнасці, агітацыя, якая 26 студзеня забаронена. Вынас бюлетэня за межы памяшкання галасавання ўвогуле не адпавядае самой працэдуры галасавання, таму што закон дакладна вызначае, якія дзеянні павінен выканаць выбаршчык на ўчастку для галасавання. Ён атрымлівае бюлетэнь, выказвае сваё волевыяўленне і апускае запоўнены бюлетэнь у скрыню для галасавання.

## Калі жывеш не па месцы рэгістрацыі

Алена Балдоўская патлумачыла, што закон прадугледжвае магчымасць галасавання не па месцы рэгістрацыі:

— Часта існуюць сітуацыі, калі чалавек зарэгістраваны ў адным горадзе, але фактычна пражывае ў іншым. У такім выпадку неабходна звярнуцца ва ўчастковую выбарчую камісію па месцы свайго фактычнага пражывання, прад'явіць пашпарт ці id-карту і абавязкова прад'явіць дакумент, які пацвярджае пражыванне на дадзенай тэрыторыі. Камісія разглядае гэтыя дакументы і прымае рашэнне, ці ёсць законныя падставы для дадатковага ўключэння грамадзяніна ў спісы альбо такіх падстаў няма.

## Галасаванне даступнае ўсім

Цэнтрвыбаркам паводле заканадаўства вызначае меры, накіраваныя на забеспячэнне даступнасці ўчасткаў для галасавання і магчымасць удзелу ў выбарах для людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі.

— У сваю чаргу, на месцах таксама прымаюцца адпаведныя меры. Гэта і размяшчэнне ўчастковых выбарчых камісій, памяшканняў для галасавання, як правіла, на першых паверхах, і наяўнасць элементаў безбар'ернага асяроддзя. На ўчастках для галасавання павінны быць лупы, трафарэты для самастойнага запаўнення бюлетэняў. На ўчастках, дзе пражываюць людзі, якія ўмеюць чытаць шрыфтам Брайля, выраблена пэўная колькасць інфармацыйных матэрыялаў аб кандыдатах гэтым шрыфтам. Акрамя таго, арганізуецца дзяжурства валанцёраў, якія будуць садзейнічаць усім, хто мае патрэбу ў дапамозе людзям, — расказала сакратар ЦВК.

Калі гаварыць аб галасаванні дома, то гэта права датычыцца той катэгорыі грамадзян, якія па ўважлівых прычынах не могуць прыйсці на ўчастак для галасавання. Для таго, каб гэта права атрымаць, неабходна звярнуцца ва ўчастковую выбарчую камісію да 18 гадзін 26 студзеня. Там на падставе гэтых заяваў будзе арганізавана галасаванне дома ў асноўны дзень выбараў.




**Варта адзначыць, што ў Беларускім Доме друку вырабляецца дастаткова вялікая колькасць прадукцыі да Прэзідэнцкіх выбараў. Гэта і метадычныя матэрыялы, і брашуры, і плакаты і, канешне ж, сувенірная кніга «Сімвалы суверэннай Беларусі», што ўручаецца моладзі, якая галасуе ўпершыню.**

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

# ПА ПРЫНЦЫПЕ ПАЛІТЫЧНАЙ НЕЙТРАЛЬНАСЦІ

## Міжнародныя назіральнікі азнаёміліся з работай Магілёўскай абласной выбарчай камісіі

— Наша місія складаецца з 300 чалавек, 40 з якіх доўгатэрміновыя назіральнікі, — удакладніў прадстаўнік місіі назіральнікаў ад СНД — **намеснік генеральнага сакратара СНД Нурлан СЕЙЦІМАЎ.** — Астатняя група назіральнікаў прыбудзе ў краіну за два-тры дні да дня галасавання і накіруецца ў раёны. Яны будуць назіраць за ходам выбарчай кампаніі, пачынаючы ад часу адкрыцця ўчасткаў і да падвядзення вынікаў галасавання на іх. У сваёй рабоце наша місія асноўваецца на прынцыпе палітычнай нейтральнасці, неўмяшання ў ход выбарчага працэсу і ўнутраныя справы дзяржавы. Наша дзейнасць засноўваецца на палажэннях выбарчага заканадаўства Рэспублікі Беларусь і міжнародна-прававой канвенцыі ў гэтай сферы.



У Магілёўскай вобласці прадстаўнікоў місіі цікавіць ход падрыхтоўкі да выбарчага працэсу, удакладненне спісаў выбаршчыкаў, ход падрыхтоўкі ўчасткаў датэрміновага галасавання, актыўнасць агітацыйнай кампаніі кандыдатаў у Прэзідэнты або іх давераных асоб. «Асноўныя вынікі работы місіі назіральнікаў будуць агучаны 27 студзеня апоўдні ў інфармацыйным цэнтры ЦВК», — удакладніў Нурлан Сейцімаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

УРАЖАННІ

# «НЕВЕРАГОДНЫ МАШТАБ БУДУ ПАМЯТАЦЬ ДОЎГА»

## На экскурсію ў Палац Незалежнасці гэтым разам завіталі работнікі структурных падраздзяленняў ААТ «Нафтан»









На «Нафтане» цяпер працуе каля 10 тысяч чалавек, у тым ліку на заводзе «Палімір» ААТ «Нафтан» — больш за 3500. Прадпрыемства выпускае шырокі асартымент прадукцыі — каля 70 найменняў. Нафтанаўская прадукцыя — гэта паліва для рэакцыйных рухавікоў, топачны мазут, шырокі асартымент змазачнага масла, нафтавыя бітумы і растваральнікі, індывідуальныя араматычныя вуглевадароды і многае іншае. Паліміраўская прадукцыя — поліэтылен высокага ціску, акрылавае валакно, прадукты арганічнага сінтэзу, вуглевадародныя фракцыі і г. д. Для гасцей з Наваполацка экскурсія ў рэзідэнцыю Прэзідэнта стала сапраўдным падарункам.

Хоць Палац Незалежнасці — пляцоўка цэнтральная, афіцыйная, статусная, але ні ў якім разе не адасобленая. Экскурсія пачалася ў зале ўрачыстых цырымоній — самай вялікай зале ў краіне. Гасцям расказалі, як будавалася рэзідэнцыя Прэзідэнта. Паколькі аб'ектаў такога маштабу да 2013 года ў краіне не было, Прэзідэнтам была пастаўлена на той час даволі складаная задача: узвесці палац, пабудаваны беларускімі майстрамі і пераважна з беларускіх матэрыялаў, за 30 месяцаў. Усё атрымалася. Трохузроўневы будынак у стылі постмадэрнізму адчыніў дзверы 21 кастрычніка 2013 года.

Далей нафтаперапрацоўшчыкам, хімікам, у тым ліку членам грамадскіх арганізацый, якія актыўна ўдзельнічаюць у грамадска-палітычным жыцці краіны, паказалі зялёную залу Палаца Незалежнасці, дзе ў лютым 2015 года прайшлі 17-гадзінныя перагаворы «нармандскай чацвёркі».

У агульнай колькасці 20 залаў Палаца Незалежнасці выконваюць асноўныя прадстаўнічыя функцыі. Самыя пазнавальныя з іх наведалі госці. Менавіта тут практычна кожны дзень працуе кіраўнік дзяржавы, прымаюцца найважнейшыя рашэнні, праходзяць міжнародныя сустрэчы. Кожная з залаў мае сваю асаблівую атмасферу дзякуючы каларыстыцы і іншым цікавым мастацкім асаблівасцям.

Час у Палацы Незалежнасці праляцеў незаўважна. Госці з цікавасцю праслухалі экскурсію і атрымалі адказы, пэўна, на ўсе хвалюючыя пытанні.

— Мяне вельмі ўразіў цёплы прыём і душэўная атмасфера, якая лунае ў Палацы Незалежнасці. Нас, жыхароў горада Наваполацка, сустрэлі сёння вельмі гасцінна, падзяліліся цікавай інфармацыяй, адказалі на ўсе пытанні. Вельмі ўдзячная за запрашэнне, — адзначыла **Алена СТРЫЖОНАК, работнік службы бухгалтэрыі ААТ «Нафтан».**

**Вераніка БЕРДНІКАВА, загадчык гаспадаркі ААТ «Нафтан»**, Палац Незалежнасці наведала ўпершыню:

— Эмоцыі ад убачанага перапаўняюць. Неверагодны маштаб рэзідэнцыі Прэзідэнта і экскурсію па ёй буду памятаць доўга.

Для **Святаслава СУШЫЦКАГА, спецыяліста па рабоце з моладдзю ААТ «Нафтан»**, наведванне палаца было марай з дзяцінства, якая здзейснілася:

— Бачыў, як праходзяць прыёмы Прэзідэнта тут. Мне таксама вельмі хацелася пабываць у кулуарах. Вось, сёння ўдалося. Уражанняў засталося шмат. Зарадзіўся энергіяй, — адзначыў ён.

**Яна ВАЛАСАЧ,**
**фота аўтара.**

НАВУКА

# ПАДАБРАЦЬ КЛЮЧЫК: як ствараюцца сучасныя лекі?



«Новыя лекі», «новы прэпарат» ад той ці іншай хваробы — так кажуць абывацелі. На мове спецыялістаў гаворка вядзецца пра «новую малекулу». Бо ў аснове любога лекавага прэпарату — хімічнае рэчыва малекулярнай структуры, што здольнае ўздзейнічаць на вірус, хваробатворную бактэрыю або пухліну і тым самым спыніць хваробу. Як страла, што трапляе ў цэль. Хоць больш дакладным будзе параўнанне з ключом, які распрацоўшчыкі лекаў падбіраюць пад канкрэтны «замок» — часта неверагодна складаны і з мноствам «сакрэтаў»...

Прэмію Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў галіне інфармацыйных тэхналогій прысудзілі ў 2024 годзе за цыкл навуковых прац «Прымяненне штучнага інтэлекту і малекулярнага мадэлявання для распрацоўкі новых лекавых прэпаратаў супраць COVID-19». Аўтары даследавання — супрацоўнікі навуковых структур Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі: **доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Аляксандр Тузікаў, доктар хімічных навук прафесар Аляксандр Андрыянаў** і **малодшы навуковы супрацоўнік лабараторыі матэматычнай кібернетыкі Канстанцін ФУРС**.

Але калі гаворка ідзе пра лекі, пры чым тут штучны інтэлект? І чаму ў сучасных фармакалагічных распрацоўках не абысціся без матэматыкаў?

## ПРЫ ЧЫМ ТУТ «ЦАРЫЦА НАВУК»?

Сучаснае эфектыўнае стварэнне лекаў немагчыма без матэматычнага мадэлявання. І першы этап такой работы — скрынінг: даследаванне сотняў тысяч хімічных злучэнняў, здольных падзейнічаць на «мішэнь» — бялок-рэцэптар або фермент. Такіх «ключоў» (малекул з патрэбным наборам уласцівасцяў), як правіла, атрымліваецца «падабраць» пад мудрагелісты «замок» хваробы ад некалькіх адзінак да некалькі дзясяткаў. Цяпер задача даследчыкаў — ацаніць уздзеянне гэтых рэчываў на арганізм чалавека: іх таксічнасць, іншыя пабочныя эфекты. Раней гэта рабілася практычна «ўручную», і дарога прэпарату ад ідэі да ложка хворага займала 10—15 гадоў. Шлях ляжаў праз доўгія даследаванні на лабараторных жывёлах і тэсціраванне на добраахвотніках. Пакуль што ад гэтых метадаў цалкам адмовіцца чалавецтва не можа, але, прынамсі, колькасць такіх даследаванняў удалося істотна скараціць. Сучасныя тэхналогіі дазваляюць з дапамогай мадэлявання ўплыву рэчыва на жывы арганізм, з улікам даных аб біяхіміі і фізіялогіі знайсці малекулы з найлепшым наборам уласцівасцяў — і потым «пабудаваць» патрэбную малекулу, аптымізуючы характарыстыкі «кандыдатаў у лекі».

## ТРЫ ШЛЯХІ ДА АДНОЙ МЭТЫ

— Займацца тэмай распрацоўкі патэнцыяльных лекаў супраць каранавіруса наш калектыў — Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі і Інстытута біяарганічнай хіміі — пачаў непасрэдна з пачатку пандэміі, — распавядае Аляксандр Тузікаў. — Трэба сказаць, што над праблемай працавала ў абодвух інстытутах значна больш людзей, чым тыя, хто атрымаў прэмію, — дадае прафесар.

Праца вялася па трох кірунках. Першы быў звязаны з камп'ютарным мадэляваннем па пошуку патэнцыяльных лекаў.

— Гэта пошук у вялікіх базах даных хімічных злучэнняў, якія патэнцыяльна могуць выступаць лекамі і якія можна было б хутка пратэсціраваць. Бо злучэнні павінны валодаць не толькі ўласцівасцямі блакіравання дзейнасці малекулярнай мішэні. Яны не павінны шкодзіць функцыям арганізма чалавека, — тлумачыць спецыяліст. — Мы атрымалі злучэнні, але іх патрабавалася пратэсціраваць біялагічнымі і медыцынскімі метадамі. Другі кірунак таксама цікавы, мы працягваем займацца ім і цяпер. Тэхналогіі штучнага інтэлекту дазваляюць генерыраваць цалкам новыя злучэнні, якіх, можа быць, не існуе ў прыродзе. У нашай працы ўжыты генератыўныя нейронныя сеткі, якія былі спачатку навучаны, а потым выкарыстаны для пошуку патэнцыяльных лекаў. Але праблема ў тым, што такія цалкам новыя злучэнні, перш чым праверыць, трэба сінтэзаваць — і гэта таксама няхуткая задача. Такім чынам, мы стварылі інструмент, але пакуль у пытаннях тэсціравання гэтых злучэнняў не крочылі далей, скажам так, камп'ютара.

Быў і трэці кірунак працы даследчыкаў — найбольш практычны. У яго межах шэраг груп навукоўцаў атрымалі цікавыя вынікі, якія ўжо рэкамендаваныя некаторымі дзяржавамі для лячэння каранавіруса, распавёў навуковец.

— Гэты падыход заснаваны на тым, што ў даследаваннях выкарыстоўваюцца ўжо распрацаваныя лекі супраць іншых захворванняў. Яны правераны, іх уласцівасці дакладна даследаваны, іх вытворчасць наладжана. І некаторыя прадэманстравалі эфектыўнасць супраць каранавіруса.

## ТОЕ, ШТО ЎЖО ЁСЦЬ

— Мы выкарыстоўвалі віртуальны скрынінг, а менавіта метады малекулярнага мадэлявання. Правялі камп'ютарны скрынінг вялікай базы біялагічна актыўных злучэнняў, якая ўключала вядомыя лекавыя прэпараты, а таксама хімічныя злучэнні, што знаходзяцца на розных стадыях клінічных выпрабаванняў, — распавядае Аляксандр Андрыянаў. — Бібліятэка, якая была намі даследавана, уключала 28 860 малекул. У выніку гэтага пошуку былі выяўлены і ідэнтыфікаваны 9 злучэнняў, якія праявілі сябе вельмі перспектыўна ў камп'ютарных эксперыментах. Гэтыя злучэнні былі пратэсціраваны метадам біямедыцынскага аналізу ў лабараторыі ўніверсітэта Фудань у Шанхаі нашымі кітайскімі партнёрамі па сумесным праекце. У выніку тэсціравання выяўлены тры злучэнні, якія праявілі магутную інгібітарную актыўнасць супраць каранавіруса SARS-CoV-2, этыялагічнага агента Covid-19 і шэрагу роднасных каранавірусаў.

Сярод гэтых трох злучэнняў міжнародная каманда навукоўцаў вылучыла злучэнне-лідар — моцную «зброю» супраць усіх вядомых цяпер штамаў каранавіруса SARS-CoV-2.

— Злучэнне ўяўляе сабой супрацьпухлінны лекавы прэпарат з вядомымі фармакакінетычнымі і таксікалагічнымі параметрамі, — адзначыў Аляксандр Міхайлавіч. — Ён называецца «Навітаклакс». Гэта эксперыментальны лекавы прэпарат, які валодае шырокім спектрам нейтралізацыйнага дзеяння супраць вядомых штамаў каранавіруса SARS-CoV-2. Ён з'яўляецца вельмі перспектыўнай базавай структурай для распрацоўкі ў самыя кароткія тэрміны новага пераральнага прэпарату шырокага спектра дзеяння супраць усіх вядомых каранавірусаў.

## СТВАРЫЦЬ МЕТАД

— Асноўная ідэя нашай работы была ў тым, каб стварыць метадалогію пошуку новых інгібітараў супраць розных захворванняў, — падкрэслівае Канстанцін Фурс. — Для гэтага ёсць розныя метады: малекулярны докінг, квантавая хімія, малекулярная дынаміка. Мы не проста выкарыстоўвалі іх паасобку. Мы стварылі суцэльны пратакол і праверылі яго на каранавірусе. І высветлілі: ён працуе эфектыўна. Калі мы можам знайсці інгібітар супраць каранавіруса, то можам знайсці ўправу і на іншыя захворванні. Гэтым цяпер і займаемся.

**— Не першы год эфектыўна працуем над пошукам лекаў супраць віруса імунадэфіцыту чалавека, — канкрэтызуе Аляксандр Тузікаў. — У цэлым сфера нашых актыўных інтарэсаў — цяжкія для лячэння інфекцыйныя захворванні, такія як, напрыклад, туберкулёз. У гэтым кірунку рэалізоўваецца вялікі міжнародны праект, ёсць і яшчэ адзін міжнародны праект — беларуска-кітайскі. Акрамя таго, мы займаемся актуальнымі праблемамі, звязанымі з пошукам лекаў ад ракавых захворванняў, а таксама шэрагу іншых хвароб, прэпараты ад якіх вельмі важныя для Беларусі і свету. Перакананы, што ў далейшым для іх лячэння будуць з'яўляцца ўсё больш эфектыўныя лекі.**

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Ч.002.00018** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витебский завод электроизмерительных приборов», г. Витебск, ул. Ильинского, 19/18, тел. 8 (0212) 66-58-10.

**Организатор, оператор электронной торговой площадке ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 30.01.2025 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).**

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 200/С-78931 площадью 487,50 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Полярная, 3А/2, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ.

**Нач. цена: 435 416,24** бел. руб. с учетом НДС.
**Задаток: 43 541,62** бел. руб.

**Лот № 2.** Капитальное строение с инв. № 200/С-50253 площадью 808,50 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Полярная, 3А/1, наименование – производственный корпус № 3, назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности. Кран-балка грузоподъемностью 3,2 т, инв. № 143798/23, расположенная в капитальном строении с инв. № 200/С-50253.

**Нач. цена: 725 006,77** бел. руб. с учетом НДС.
**Задаток: 72 500,68** бел. руб.

Объекты находятся на земельном участке с кадастровым № 240100000001000169 площадью 3,1357 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Полярная, 3А (общая долевая аренда).

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами:** до 16.00 29.01.2025.

**Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия электронных торгов:** Победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения эл. торгов и утверждения протокола эл. торгов возместить затраты на организацию и проведение эл. торгов, расходы Продавца на проведение независимой оценки и оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; заключить договор купли-продажи предмета эл. торгов в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты проведения эл. торгов и утверждения протокола эл. торгов, оплатить предмет электронных торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи. *Расходы Продавца на проведение независимой оценки составляют по лоту № 1 – 200,00 бел. руб. с НДС, по лоту № 2 – 350,00 бел. руб. с учетом НДС.*

С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел. Рыбакова Ольга Петровна, +375447430026.



Центр Промышленной Оценки
• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | Торговое унитарное предприятие «СМК-трейдинг», 223610, Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Копыльская, д. 5, здание магазина Мясной ряд № 81. УНП 691977332 |
| **Оператор/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1; www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов:**
**легковой автомобиль внедорожник универсал (SUV UNIVERSAL) TOYOTA LAND-CRUISER,**
**рег. знак 8222 АР-5, 2008 г. в., инв. № 72925.**
**Адрес: Минская область, г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 18**

**Начальная цена, с НДС 20 % – 20 000,00 бел. руб.**

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять) рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи. Расходы за снятие с учета/регистрации несутся покупателем

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение 6 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 17.02.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются: **по 14.02.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, 220004, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1 |
| **Продавец** | ОАО «Авиакомпания Трансавиаэкспорт», 220034, г. Минск, ул. Захарова, 44 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов: имущество (б/у), расположенное по адресу: г. Минск, территория Национального аэропорта «Минск»**

| № лота | Инв. номер | Предмет электронных торгов | Начальная цена, долл. США (без НДС) |
|---|---|---|---|
| 1 | 0010 | **Авиационный двигатель Д-30КП-2 03053038902037,** дата выпуска – 31.07.1989 | 240 000 |
| 2 | 0039 | **Авиационный двигатель Д-30КП-2 03053028502084,** дата выпуска – 28.06.1985 | 185 000 |
| 3 | 0033 | **Авиационный двигатель Д-30КП-2 03053019002026,** дата выпуска – 27.02.1990 | 240 000 |

Шаг аукциона: **5 %** от текущей цены

Резиденты Республики Беларусь дополнительно к цене продажи предмета аукциона уплачивают НДС по ставке 20 %. Для нерезидентов Республики Беларусь цена продажи предмета аукциона со ставкой НДС 0 % при экспорте товаров на территорию государств ЕАЭС либо за пределы Республики Беларусь под таможенной процедурой экспорта

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется в белорусских рублях (**BYN**) по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату платежа на счет **BY92BELB 30120048350080226000;** нерезидентами Республики Беларусь задаток может перечисляться в в долларах США (**USD**) – **BY03BELB30120048350010226000,** в валютном эквиваленте по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату платежа на счет: в евро (**EUR**) – **BY70BELB30120048350030226000 или** в российских рублях (**RUB**) – **BY85BELB30120048350020226000** в ОАО «Банк БелВЭБ» по адресу: г. Минск, БИК BELBBY2X, получатель платежа – «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638. В случае если покупателем станет нерезидент Республики Беларусь, денежный эквивалент суммы задатка, внесенного покупателем в иностранной валюте, перечисляется Организатором электронных торгов в белорусских рублях на расчетный счет продавца по курсу, установленному ОАО «Банк БелВЭБ» на дату продажи валюты, и засчитывается в счет окончательной стоимости предмета аукциона

**Срок подписания договора купли-продажи: 20 рабочих дней** после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания покупателю. Продавец вправе отказаться от подписания договора купли-продажи в случае, если покупателем по результатам аукциона будет определена организация или физическое лицо, причастные к террористической и (или) экстремистской деятельности. В таком случае результаты торгов аннулируются организатором аукциона по заявлению продавца, задаток участника аукциона, вознаграждение и затраты организатора аукциона возврату не подлежат

**Условия оплаты предмета электронных торгов.** Оплата должна быть произведена в размере 100 % в течение **7 рабочих дней** со дня заключения договора купли-продажи. **Передача предмета аукциона** в течение **30 календарных дней** после 100 % оплаты

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.
**Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: **www.ipmtorgi.by.** Страница лота по указанному адресу содержит также более подробную информацию о предмете электронных торгов, о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену.
Участник аукциона самостоятельно ознакомляется с предметом аукциона, его комплектностью, наличием документации и текущим техническим состоянием в месте его нахождения до начала торгов. Участие в торгах подтверждает факт ознакомления с предметом аукциона. Погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по вывозу предмета аукциона

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан оплатить организатору торгов **о вознаграждение 0,14 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Рэспубліка» от 22.11.2024 г.

Организатор электронных торгов, продавец имеют право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов**:** **30.01.2025 с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки, в том числе задаток для участия в электронных торгах, принимаются по **29.01.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17 280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |



## О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**Березинского района Минской области д. Матевичи, ул. Партизанская, д. 39**

Капланецкий сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом по адресу: Минская область, Березинский район, д. Матевичи, ул. Партизанская, д. 39 (полный адрес указан согласно похозяйственной книге). Собственник – Измер Елена Ивановна, умерла 09.03.2013 г.

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания, сообщить в Капланецкий сельисполком по телефонам: 8 01715 62332, 801715 62333 (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням).

Также информацию можно прислать по адресу: **223306, Минская область, Березинский район, д. Капланцы, ул. Погостская, 2.**

УНП 600092462

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Белцветмет», Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, 42/2, район аг. Гатово. УНН 100088666 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов:** бывшее в употреблении имущество. Местоположение: Минский р-н, Новодворский с/с, аг. Гатово, 42/2

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль MAZ 6501A8-325-000, р/з АХ 0174-5,** 2013 г. в. | **46 368,00** |
| 2 | **Автомобиль MAZ 6501A8-325-000, р/з АО 5542-5,** 2013 г. в. | **37 056,00** |
| 3 | **Прицеп MAZ 856103-(010), р/з А 8286 В-5,** 2013 г. в. | **18 624,00** |
| 4 | **Прицеп MAZ 856103- (010), р/з А 8287 В-5,** 2013 г. в. | **18 624,00** |

**Цена снижена на 20 %. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | **10 (десять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи |

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 5 % от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 01.11.2024

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 04.02.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 03.02.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**



ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**Капланецкий сельский исполнительный комитет** извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Матевичи, ул. Борисовская, д. 14 (адрес указан согласно похозяйственной книге), имеющий основания для признания его пустующим.**

**Сведения о жилом доме (из акта)**

Наружные размеры одноквартирного, жилого дома: 4 х 8 м.

Площадь: 36,0 кв. м.

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1949 года постройки.

Материал стен: деревянный.

Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): собственник – Самец Михаил Никитович (умер 27.05.2006 г.), наследник – Самец Зинаида Васильевна (умерла 28.03.2011 г.).

Предположительный срок непроживания в одноквартирном, жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 10 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Капланецкий сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Капланецкий сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Капланецкий сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

**Телефоны для справок: 801715 62 3 32, 801715 62 3 33.**

УНП 600092462



О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**Березинского района Минской области д. Матевичи, ул. Борисовская, д. 14**

Капланецкий сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом по адресу: Минская область, Березинский район, д. Матевичи, ул. Борисовская, д. 14 (полный адрес указан согласно похозяйственной книге). Собственник – Самец Михаил Никитович (умер 27.05.2006 г.), наследник – Самец Зинаида Васильевна (умерла 28.03.2011 г.).

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания, сообщить в Капланецкий сельисполком по телефонам: **8 01715 62332, 801715 62333 (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням).**

Также информацию можно прислать по адресу: **223306, Минская область, Березинский район, д. Капланцы, ул. Погостская, 2.**

УНП 600092462


# РЫНАК ПРАЦЫ: СІТУАЦЫЯ ПАЛЯПШАЕЦЦА

## Колькасць беларусаў, занятых у эканоміцы, выйшла на станоўчы трэнд

Эканамічны рост і праактыўная інвестыцыйная палітыка ўрада стымулюе попыт на кадры, які, у сваю чаргу, уплывае на рост заробкаў і змяншэнне ўзроўню беспрацоўя ў краіне. Такія высновы можна зрабіць, калі прааналізаваць апошнія даныя Нацыянальнага статыстычнага камітэта.



У другой палове 2024 года сітуацыя на рынку працы выйшла на станоўчы трэнд. Па афіцыйных статыстычных даных, у лістападзе ў эканоміцы Беларусі было занята 4120,5 тыс. чалавек (у параўнанні з папярэднім месяцам рост на 3 тыс.); у кастрычніку — 4117,5 тыс. чалавек (+8,8 тыс.); верасні — 4108,7 тыс. чалавек (-9,8 тыс.); у жніўні — 4118,5 тыс. (+3,6 тыс.); у ліпені — 4114,9 тыс. (+1,4 тыс.).

Аб прынцыповым паляпшэнні сітуацыі на рынку працы сведчыць і скарачэнне беспрацоўя да рэкорднага ўзроўню. Па выніках III квартала 2024 года, узровень беспрацоўя ў Беларусі, разлічаны па метадалогіі МАП, склаў 2,9 % ад агульнай колькасці рабочай сілы. На 1 лістапада 2024 года на ўліку ў якасці беспрацоўных знаходзіліся 3,7 тыс. чалавек. На гэту ж дату наймальнікамі былі заяўлены звесткі аб наяўнасці 163,7 тыс. свабодных рабочых месцаў, з іх больш як 12 тыс. з выдзяленнем жылля. Попыт на работнікаў па прафесіях рабочых спецыяльнасцяў склаў 68 % ад агульнай колькасці вакансій.

**Што датычыцца сярэдняй заработнай платы, то тут назіраецца рост шосты месяц запар. Прычым тэмпамі, якія перавышаюць рост ВУП. З аднаго боку, гэта стымулюе рост рэальных даходаў насельніцтва. З другога — у сярэднетэрміновай перспектыве пры захаванні цяперашняга ўзроўню прадукцыйнасці працы магчыма зніжэнне ўзроўню рэнтабельнасці прадпрыемстваў.**

Назіраецца і рост працоўнай міграцыі. За апошнія два гады гэты паказчык вырас у паўтара раза. У Беларусі працуе звыш 60 тысяч замежных грамадзян з больш чым 130 краін. На такія сферы, як прамысловасць, будаўніцтва, гандаль, транспартная дзейнасць, прыпадае каля 2/3 ад агульнай колькасці працоўных мігрантаў. Большая частка працоўных мігрантаў закрывае патрэбу ў рабочых спецыяльнасцях.

Варта адзначыць, што беларускае заканадаўства забяспечвае абарону нацыянальнага рынку працы. У прыватнасці, дзейнічае правіла, у адпаведнасці з якім прыём на работу іншаземца дапускаецца толькі пры ўмове, што вакансія не запатрабавана з боку грамадзян Беларусі. Пры гэтым у 2023 годзе ўведзены спрошчаны доступ замежных грамадзян для работы па найбольш запатрабаваных прафесіях. Мінпрацы і сацыяльнай абароны штогод распрацоўвае пералік прафесій, на якія можна прыцягваць іншаземцаў без спецыяльнага дазволу. Калі першапачаткова такі спіс уключаў 10 прафесій, то сёння гэта 53 пазіцыі. Але новыя выклікі ставяць на парадак дня яго ўдасканальванне.

Нягледзячы на тое што ў рамках Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі мы маем адзіны рынак працы, сітуацыя неадназначная і ўяўляе пэўную пагрозу для беларускіх вытворцаў.

**З мэтай выпрацоўкі сістэмных мер па гэтай праблематыцы беларускі ўрад толькі ў мінулым годзе распрацаваў і зацвердзіў шэраг стратэгічных і тактычных ініцыятыў.**

✓ Указам № 1 ад 03.01.2024 і пастановай Саўміна № 48 ад 23.01.2024 адпаведна зацверджаны Канцэпцыя дзяржаўнай кадравай палітыкі і Канцэпцыя міграцыйнай палітыкі на 2024—2028 гады.

✓ Указам № 105 ад 21.03.2024 «Аб звышурочнай рабоце і рабоце ў выхадныя дні ў прамысловых арганізацыях» прадугледжваецца магчымасць па ўзгадненні з прафсаюзам і са згоды работнікаў павялічваць ліміт звышурочных работ і работ у выхадныя дні, калі ёсць абгрунтаваная вытворчая і эканамічная неабходнасць.

✓ Указам № 402 ад 29.10.2024 «Аб сацыяльнай падтрымцы» вызначаны шэраг новых мер па ўзмацненні сацыяльнай падтрымкі асобных катэгорый грамадзян. У прыватнасці, прадугледжваецца адмена абмежавання на памер пенсіі працоўным пенсіянерам. З улікам таго што ў Беларусі працягвае працаваць каля 445 тыс., або 21,5 % ад агульнай колькасці пенсіянераў, гэты дакумент не толькі павышае пенсіённыя выплаты, але і стварае стымул як мага даўжэй працягваць працоўную дзейнасць. А наймальнікам гэта дасць магчымасць дадаткова прыцягнуць або затрымаць на рабоце спецыялістаў з вялікім досведам.

**У той жа час вырашэнне бягучых праблем на рынку працы ў цэлым знаходзіцца не толькі ў рамках росту колькасці працоўных рэсурсаў. Як сведчыць не толькі сусветны вопыт, але і практыка шэрагу айчынных прадпрыемстваў, значны ўнёсак можа зрабіць і павышэнне якасных паказчыкаў.**

У прыватнасці, **эфектыўны спосаб пазбегнуць катастрафічнага недахопу работнікаў — апераджальнымі тэмпамі павялічваць прадукцыйнасць працы.** Разлікі беларускіх эканамістаў паказалі, што наша краіна па эфектыўнасці выкарыстання рабочых рук хоць і займае 71-е месца са 168 краін свету, але ў параўнанні з эканамічна развітымі краінамі прадукцыйнасць працы ў Беларусі ніжэйшая ў разы. Для дасягнення парытэту з апошнімі неабходна, каб рост прадукцыйнасці складаў штогод 2,4 %, гэта значыць удвая больш за сярэдні паказчык за апошнія дзесяць гадоў. З улікам таго што кіраўнік дзяржавы анансаваў наступнае пяцігоддзе як «пяцігодку якасці», уяўляецца мэтазгодным разгледзець магчымасць уключэння вышэйназванага паказчыка ў якасці мэтавага.

**У заключэнне некалькі рэкамендацый як кіраўнікам беларускіх кампаній, так і іх эйчарам.**

✓ Ва ўмовах дэфіцыту спецыялістаў з практычнымі навыкамі работы **варта прыгледзецца да патэнцыяльных кандыдатаў без профільнай вышэйшай або спецыяльнай адукацыі або з незакончанай вышэйшай, але якія маюць практычны вопыт у сваёй сферы.** Пры наяўнасці шматлікіх навучальных анлайн-платформаў, а галоўнае — жадання, такіх людзей апошнім часам становіцца ўсё больш. І гэта нядрэнная крыніца кадраў для вашай кампаніі.

✓ **Яшчэ адна парада — гэта настаўніцтва.** Пастаяннае, а галоўнае сістэмнае навучанне і перадача назапашанага досведу не толькі моладзі, але і сваім калегам, павінна стаць паўсядзённай практыкай не толькі для падрыхтоўкі кіраўніцкага «кадравага рэзерву», але і для лінейных падраздзяленняў. **Прынцып «звальняешся — падрыхтуй на сваё месца два–тры спецыялісты»** павінен стаць неад'емнай умовай кантракта падчас найму работніка на ключавыя пасады.

**Георгій ГРЫЦ, кандыдат эканамічных навук.**

ДОБРАЯ НАВІНА

# ШАНЦ ДЛЯ МАЛАДЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

## Што зменіцца на рынку арэнднага жылля?

З 1 студзеня ўступіў у дзеянне Указ Прэзідэнта ад 29 жніўня 2024 года № 344 «Аб субсідзіраванні юрыдычных асоб пры ўзвядзенні або набыцці жылых памяшканняў», якім прадугледжаны дадатковыя крыніцы фінансавання будаўніцтва і куплі арэнднага жылля. У Міністэрстве архітэктуры і будаўніцтва растлумачылі, што зменіцца на рынку арэнднага жылля.



Адным са спосабаў паляпшэння жыллёвых умоў грамадзян застаецца магчымасць прадастаўлення ім арэнднага жылля, якое асабліва запатрабавана ў маладых сем'яў і маладых спецыялістаў, паколькі яно не толькі больш даступнае, але і павышае іх мабільнасць.

Згодна з Указам № 344, юрыдычным асобам (дзяржаўным арганізацыям і гаспадарчым таварыствам) прадастаўляецца права на атрыманне субсідый у памеры 50 % стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка для выплаты часткі працэнтаў за карыстанне крэдытамі, якія выдаюцца банкамі на ўзвядзенне або набыццё жылля, для наступнага прадастаўлення жылых памяшканняў, пабудаваных або набытых з выкарыстаннем субсідый, сваім работнікам па дагаворах найму арэнднага жылля і дагаворах найму жылога памяшкання прыватнага жылфонду.

«Немалаважным з'яўляецца той факт, што гэтым указам юрыдычным асобам дэлегаваны паўнамоцтвы на самастойнае вызначэнне парадку і ўмоў прадастаўлення жылых памяшканняў, узведзеных або набытых з субсідзіраваннем, а таксама катэгорый грамадзян з ліку работнікаў, якія маюць першачарговае права на прадастаўленне такіх жылых памяшканняў, — растлумачылі ў міністэрстве. — Пры гэтым не менш за 20 % ад агульнай колькасці жылых памяшканняў, узведзеных з субсідзіраваннем, юрыдычныя асобы павінны прадастаўляць у першачарговым парадку маладым спецыялістам і маладым грамадзянам да 31 года».

Такім чынам, прэферэнцыі, якія прадастаўлены ўказам, даюць магчымасць юрыдычным асобам павялічыць аб'ёмы ўзвядзення арэнднага жылля, дапамагаюць прыцягнуць на работу маладых спецыялістаў і маладых грамадзян шляхам вырашэння жыллёвага пытання і замацаваць іх на прадпрыемствах на працяглы тэрмін, каб зменшыць дэфіцыт кваліфікаваных кадраў.

У Мінбудархітэктуры нагадалі, што парадак прадастаўлення арэнднага жылля, у тым ліку катэгорыям грамадзян, якія маюць права на яго першачарговае атрыманне, замацаваны ў Жыллёвым кодэксе. Фінансаванне будаўніцтва вядзецца за кошт бюджэтных сродкаў, а таксама сродкаў, што атрыманы ад выдзялення арэнднага жылля, і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

«Дагэтуль асноўнай крыніцай фінансавання ўзвядзення арэнднага жылля з'яўляліся бюджэтныя сродкі, — адзначылі ў міністэрстве. — Нягледзячы на тое што за апошнія пяць гадоў аб'ёмы ўзвядзення арэнднага жылля за кошт бюджэтных сродкаў павялічыліся ўтрая, попыт на яго значна перавышае прапанову».

# СМАЧНЫ РЭСУРС

## Біржавы экспарт малакапрадуктаў вырас у 9 разоў

Летась праз Беларускую ўніверсальную таварную біржу рэалізавана звыш 181 тысячы тон малочнай прадукцыі, што амаль у 9 разоў больш, чым у 2023 годзе, паведамілі ў прэс-службе БУТБ. І дадалі, што асноўнымі кірункамі паставак былі краіны СНД, Грузія, Кітай, Манголія, ААЭ, Сербія, Сінгапур і Турцыя.

— Адначасова на экспартных біржавых таргах назіраўся ўзыходзячы цэнавы трэнд, абумоўлены павышаным попытам з боку замежных пакупнікоў на большасць пазіцый дадзенай таварнай групы, — адзначылі на таварнай біржы, прывёўшы наступныя лічбы. — За IV квартал 2024-га біржавая каціроўка на сухое абястлушчанае малако вырасла на 22 % (да 257 RUB/кг) пры пастаўцы ў Расію і на 12 % (да 2,47 USD/кг) пры пастаўцы ў ЕАЭС, СНД і трэція краіны.

У БУТБ адзначылі, што нязначнае зніжэнне кошту было характэрна толькі для сметанковага масла ў сувязі з узмацненнем канкурэнцыі на ключавым для Беларусі рынку збыту — Расійскай Федэрацыі, якая з мэтай стрымлівання інфляцыйных працэсаў істотна нарасціла пастаўкі масла з такіх краін, як Індыя, Іран і Турцыя. У выніку да канца 2024-га сярэднеўзважаная біржавая каціроўка на сметанковае масла 72,5 % тлустасці склала 731 RUB/кг, а на сметанковае масла 82,5 % тлустасці — 801 RUB/кг.

— Кошты на біржавых таргах фарміраваліся ў адпаведнасці з кан'юнктурай рынку і ў большасці выпадкаў перавышалі індыкатыўныя значэнні, устаноўленыя рабочай групай пры Мінсельгасхарчы Рэспублікі Беларусь, — растлумачылі ў БУТБ, дадаўшы, што за некаторыя лоты канкурыравалі да шасці замежных пакупнікоў, і гэта дазваляла беларускім малакаперапрацоўчым прадпрыемствам нават у перыяды паніжанага попыту атрымліваць дадатковую выручку.




**ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Мётча Агро»**

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 978 | Агрегат почвообрабатывающий посевной АПП-6Д, инв. № 3592 | 25848,00 | 2 584,80 | 1 292,40 |
| 980 | Машина первичной очистки зерна МЗС-20, инв. № 3720 | 3960,00 | 396,00 | 198,00 |
| 1023 | Погрузчик с телескоп. стрелой АМКОДОР 527 (ОК-5 0612), 2010 г. в., инв. № 3618 | 19238,40 | 1 923,84 | 961,92 |
| 981 | Распределитель минеральных удобрений РУ-7000, инв. № 1292 | 7358,40 | 735,84 | 367,92 |

В отношении лотов проводятся одиннадцатые повторные торги. **В отношении лота № 978 стоимость снижена на 80 %. В отношении лота № 1023 стоимость снижена на 76 %. В отношении лота № 980 стоимость снижена на 45 %. В отношении лота № 981 стоимость снижена на 27 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 232 (30366) от 28.11.2024, стр. 12

**Местонахождение лотов:** Минская обл., Борисовский р-н, Метченский с/с, вблизи д. Старая Метча. GPS-координаты: 54.179354, 28.711073

Лоты имеют обременения в виде лизинга. Вопросы по обременениям по тел. +375293110464 (Анастасия). В случае признания торгов состоявшимися либо наличия единственного участника, согласившегося приобрести лот по начальной цене, увеличенной на 5 %, все обременения в отношении такого лота снимаются

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **29 января 2025 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 16 января 2025 года до 16.00 27 января 2025 года |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ООО «Метча Агро», проводимых 29.01.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: по лотам №№ 978, 1023 – 7 %, по лоту № 981 – 8 %, по лоту № 980 – 9 % от конечной цены предмета торгов.** Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Андрей, +375293042560.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ООО «Мётча Агро» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: +375293110464, 80173958917 (Минская обл., Борисовский р-н, Метченский с/с, д. Старая Метча, ул. Почтовая, д. 1, УНП 190564818)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |



**ООО «Юридическая компания Аспект» проводит восьмые повторные публичные торги в форме открытого аукциона по продаже имущественных прав ликвидируемого юридического лица – ОАО «Минскторгавтотранс»**

| № п/п | Наименование лота | Начальная цена без НДС, руб. | Шаг торгов (5 %), руб. | Задаток для участия в торгах (10 %), руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Дебиторская задолженность ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз» (УНП 600012322) на сумму 155 513,32 бел. руб. по договору купли-продажи № 17-10/01 от 17.10.2019 г. | 14 672,50 | 733,62 | 1 467,25 |

*Торги назначены на **27.01.2025 г. в 10.30** по адресу: **г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, оф. 401, холл (4 этаж)**. Срок приема заявок, внесения задатка для участия в торгах – до **24.01.2025 г.** включительно. Заявки принимаются организатором торгов по месту проведения торгов в рабочие дни с 09.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30)*

| | |
|---|---|
| **Продавец** | **ОАО «Минскторгавтотранс»** |
| **Организатор торгов** | **ООО «Юридическая компания Аспект»** |
| **Реквизиты для оплаты задатка** | **Бенефициар – ОАО «Минскторгавтотранс» р/с № BY86OLMP30121000371960000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, г. Минск, УНП 100217272** |

Условия проведения торгов размещены на сайте ООО «Юридическая компания Аспект» – «aspekt-avs.by» в разделе «Актуальные аукционы.
Лоты на реализации. Дебиторская задолженность» по ссылке «https://aspekt-avs.by/aykciony_info/»

Объявление о предыдущих торгах опубликовано в газете «Звязда» 18.05.2024 (стр. 14), 26.06.2024 (стр. 12), 16.07.2024 (стр. 14), 01.08.2024 (стр. 6), 15.08.2024 (стр. 7), 03.09.2024 (стр. 14), 21.09.2024 г. (стр. 15), 24.12.2024 г. (стр. 13)

Дополнительная информация о порядке проведения торгов по телефону +375 (44) 5986627 в рабочие дни с 09.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30).
Ознакомление с документами на лот возможно по месту проведения торгов после предварительного согласования по тел. +375 (44) 5986627

# НАВЯДЗЕННЕ ПАРАДКУ — СПРАВА СІСТЭМНАЯ

## Як у Год добраўпарадкавання ўключыцца Мінпрыроды

Указам Прэзідэнта 2025 год аб'яўлены ў Беларусі Годам добраўпарадкавання. Ён дае старт пяцігодцы якасці і накіраваны на аб'яднанне намаганняў дзяржавы і грамадзян у павышэнні якасці жыцця, навядзенні парадку на зямлі і паляпшэнні экалагічнага стану. Міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей МАСЛЯК расказаў аб ключавых задачах і рабоце ведамства ў рамках Года добраўпарадкавання.




Найважнейшымі задачамі Мінпрыроды ў 2025 годзе стане забеспячэнне права грамадзян на спрыяльнае навакольнае асяроддзе, якасць якога гарантуе экалагічную бяспеку і ўстойлівае функцыянаванне натуральных экалагічных сістэм.

— Штогод пытанням навядзення парадку на зямлі і добраўпарадкавання тэрыторыі ўдзяляецца асаблівая ўвага. Таму гэта не разавая акцыя, а сістэмная работа, якая праводзіцца рэгулярна на планавай аснове ўсімі зацікаўленымі, — падкрэсліў міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей Масляк.

Кожны год Саветам Міністраў зацвярджаецца рэспубліканскі план мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі, у рамках якога праводзіцца добраўпарадкаванне месцаў адпачынку ўздоўж аўтамабільных дарог, азеляненне прыдамавых і іншых тэрыторый населеных пунктаў, ствараюцца і добраўладкоўваюцца паркі, скверы, бульвары, экалагічныя сцежкі. У распрацоўцы знаходзіцца аналагічны дакумент на 2025 год.

— Мінпрыроды праведзены папярэдні аналіз паказчыкаў выканання плана мінулага года, — адзначыў міністр. — На яго падставе і з улікам прынятага ўказа Прэзідэнта будуць сфарміраваны адпаведныя заданні (больш напружаныя, але аб'ектыўныя) і даведзены непасрэдна выканаўцам.

Так, узровень азяляненасці за апошнія пяць гадоў гарадоў і райцэнтраў Беларусі складае 40 %. Пры гэтым колькасць населеных пунктаў, якія дасягнулі гэтай нормы, павялічылася на звыш 30 %. Самымі зялёнымі гарадамі з'яўляюцца Віцебск (49,1 %), Брэст (45,7 %) і Магілёў (44,3 %).

Летась было высаджана 350 тыс. дрэў, 567 тыс. кустоў і больш за 20,5 млн кветак. Уздоўж аўтадарог было высаджана звыш 11,5 тыс. дрэў і на 33 тыс. больш кустоў, чым у 2023 годзе.

Працягваецца барацьба з распаўсюджваннем інвазійных раслін — баршчэўнікам Сасноўскага і сумнікам канадскім. Планамерная шасцігадовая праца дазволіла знішчыць баршчэўнік Сасноўскага на плошчы больш за 4,9 тыс. га, сумнік — на звыш 2,5 тыс. га. Найбольшы поспех комплексных мерапрыемстваў зафіксаваны ў Брэсцкай вобласці, дзе ў мінулым годзе ліквідаваны і зняты з уліку ўсе месцы росту баршчэўніку. Аднак размовы аб паслабленні кантролю не ідзе — наадварот, барацьба будзе актывізавана.

— Падтрымліваюцца ў належным стане экалагічныя сцежкі, зоны адпачынку, турыстычныя стаянкі на тэрыторыі запаведнікаў, нацыянальных паркаў і заказнікаў. Павялічылася таксама агульная плошча ААПТ. Цяпер яны складаюць 9,2 % тэрыторыі нашай краіны. За апошнія пяць гадоў было адкрыта 15 новых экасцежак, у тым ліку пяць — у 2023 і 2024 гадах. Усяго іх у Беларусі 210, — адзначыў Сяргей Масляк.

Вялікая работа праводзіцца па скарачэнні аб'ёмаў і перапрацоўцы адходаў, стварэнні эфектыўнай сістэмы абыходжання з адходамі і ўдасканаленні нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць дадзеную праблему. У пачатку кастрычніка 2024 года набыла моц новая рэдакцыя Закона «Аб абыходжанні з адходамі». Каб растлумачыць навацыі насельніцтву, пры Мінпрыроды быў створаны Каардынацыйны савет па пытаннях абыходжання з адходамі, у склад якога ўвайшлі прадстаўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання, суб'екты гаспадарання і прадстаўнікі бізнесу ў сферы абыходжання з адходамі.

**Штогод у Беларусі ўтвараецца каля 50 млн тон адходаў вытворчасці. Дзякуючы створанай сістэме рэгулявання, узровень іх выкарыстання з улікам буйнатанажных складае 33 %, без іх — каля 90 %. За 11 месяцаў 2024 года аб'ём утварэння цвёрдых камунальных адходаў склаў 3,8 млн т, узровень іх выкарыстання — 38,4 %.**

— Чым больш ствараецца аб'ектаў па выкарыстанні адходаў, тым большая колькасць адходаў уключаецца ў гаспадарчы абарот, што, у сваю чаргу, садзейнічае змяншэнню колькасці адходаў, якія захоўваюцца, і зніжэнню антрапагеннай нагрузкі на навакольнае асяроддзе, — акцэнтаваў Сяргей Масляк.

**Александрына ПАРШЫНА.**
**Фота аўтара.**

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Гродно 18 февраля 2025 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб. | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Гродненская область, г. Гродно, ул. Ровная, 12, микрорайон «Барановичи-9», У-139, 440100000003005934** | 0,1003 | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение. Фундамент: железобетон; площадь застройки: 156 кв. м, готовность: 11 % | 29 138,44 (9 690,27; 19 448,17) | 353,64 | 5 800 |
| 2 | **Гродненская область, г. Гродно, У-114, микрорайон «Зарица-5», 440100000003004664** | 0,1052 | Не завершенное незаконсервированное капитальное строение, степень готовности: 14 %. Фундамент: бутобетон; полы: бетон, наружная площадь: 136 кв. м | 31 135,01 (9 947,73; 21 187,28) | 382,44 | 6 200 |

Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок с момента подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома в установленный срок. Победитель аукциона обязан в течение срока строительства возместить затраты на инженерную и транспортную инфраструктуру согласно индивидуально разработанному проекту в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 и решением Гродненского городского исполнительного комитета от 12.04.2022 г. № 260.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», телефоны: +375 (152) 626055, 626056.

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, код назначения платежа 40901, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Аукцион состоится 18 февраля 2025 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

**Прием документов, консультации и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 20 января по 12 февраля 2025 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

# У КУПЕЛЬ — БЯСПЕЧНА

## Спецыялісты расказалі пра Вадохрышча без наступстваў

У нядзелю праваслаўныя хрысціяне адзначаюць адно з 12 вялікіх свят — Вадохрышча, якое завяршае калядныя святкі. Галоўныя традыцыі ў гэты дзень — асвяшчэнне вады ў храмах і акунанне ў ледзяную палонку. Чакаецца, што каля 300 тысяч беларусаў наведаюць падрыхтаваныя купелі.

### ТОЛЬКІ Ў АБСТАЛЯВАНЫХ МЕСЦАХ

Сёлета ў краіне падрыхтавана каля 180 абсталяваных купеляў, на якіх дзеля бяспекі будуць працаваць каля 330 супрацоўнікаў АСВОД, МНС і МУС і хуткай медыцынскай дапамогі. У тым ліку шэсць купеляў будуць гатовы прыняць аматараў зімовага купання ў Мінску.

Як расказаў **вадалазны спецыя-ліст цэнтра вадалазна-ратавальнай службы РАСП МНС Мікалай ВАСІЛЬЕЎ**, месцы для купання павінны адпавядаць санітарна-гігіенічным нормам, дно павінна быць плаўным, без уступаў, глыбінёй ад 1,2 да 1,8 метра. Купелі спалучаюцца з берагам, надзейна замацаваным мосцікамі ці трапамі. Сходы ў ваду павінны быць зручнымі і мець поручні. Асноўны прыток людзей чакаецца ў ноч з 18 на 19 студзеня, таму ўстанаўліваюцца светлавыя прыборы, каб падыходы і сама купель былі асветленымі.

Паколькі сёлетняя зіма не адзначаецца мінусавымі тэмпературамі, таўшчыня лёду пакуль не больш за 3—5 см. Таму выхад на яго катэгарычна забаронены. Побач з выхадам з купелі будуць арганізаваны палаткі з ацяпляльнымі прыборамі і распранальні, дзе можна сагрэцца.



### ПРАВІЛЬНА АКУНАЕМСЯ Ў ПАЛОНКУ

Акунанне ў палонку раз на год не мае нічога агульнага з загартоўваннем, галоўная ўласцівасць якога — пастаянства, нагадвае **загадчык 11-й падстанцыі гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі Яўген ЮДАКОЎ**.

**— Нават здаровыя людзі, якія не маюць супрацьпаказанняў да купання, усё роўна павінны падрыхтавацца да акунання: за некалькі тыдняў варта рабіць абліванні, пачынаючы з цёплай вады і штодзённа паніжаючы градус, — кажа ўрач.**

Акунацца, тым больш скакаць у ваду з галавой, не рэкамендуецца. Варта заходзіць паступова, акунацца па шыю. Перад акунаннем трэба размяцца. Акунацца трэба не на галодны страўнік — лепш, калі ў арганізма будзе запас энергіі. Знаходзіцца ў вадзе не рэкамендуецца больш за некалькі хвілін. Пасля неабходна насуха выцерці цела, надзець цёплае сухое адзенне і сагрэцца ў цёплым памяшканні.

**— Нягледзячы на тое, што тэмпература паветра прагназуецца плюсавай, вада будзе дастаткова халоднай — каля 2 °C, а гэта стрэс для арганізма. І кожны павінен добра падумаць і ацаніць свой стан здароўя перад тым, як акунацца, — звяртае ўвагу Яўген Юдакоў.**

Нельга акунацца ў ледзяную ваду людзям з вострымі захворваннямі ці абвастрэннямі хранічных хвароб, цяжарным жанчынам, дзецям да сямі гадоў (гэта звязана з недасканаласцю цеплarэгуляцыі дзіцячага арганізма), людзям, старэйшым за 75 гадоў. Супрацьпаказаннямі з'яўляецца наяўнасць эпілепсіі, схільнасці да сутаргаў, цукровы дыябет, гіпертанія. З асцярожнасцю да акунання трэба падыходзіць людзям з хранічнымі сардэчна-сасудзістымі захворваннямі, хваробамі органаў дыхання, нырак, суставаў і іншых унутраных органаў.

**Алена КРАВЕЦ.**

### У тэму

## Пазбегнуць пераахаладжэнняў і абмаражэнняў

Найчасцей абмаражэнню падвяргаюцца часткі цела, якія выступаюць: пальцы рук і ног, вушы і нос. Таму варта выкарыстоўваць шапку, шарф, пальчаткі, абавязкова насіць зручны няцесны абутак.

Алкагольнае ап'яненне абцяжарвае пераахаладжэнне. Напачатку яно дае ўяўнае адчуванне сагравання, затое потым пераахаладжэнне адбываецца хутчэй, чым у чалавека, які алкаголь не ўжываў.

Калі разумееце, што губляецца адчувальнасць у пальцах ці іншых частках цела, не трэба расціраць іх снегам — гэта можа прывесці да дадатковай траўматызацыі і так пашкоджанай скуры. Выкарыстоўваць для гэтых мэт спірт ці гарэлку таксама не рэкамендуецца, яны выклікаюць дадатковае цеплааддзяленне ад тканак. Не трэба саграваца і ў гарачай ванне: калі нейкая частка цела пераахаладзілася, саграваць неабходна паступова, пачынаючы з летняй вады, павялічваючы тэмпературу.

У мароз трэба абмежаваць сваё знаходжанне на вуліцы без крайняй неабходнасці і выбіраць правільнае адзенне. Не варта курыць, бо змяншаецца перыферычная цыркуляцыя крыві, тым самым арганізм больш адчувальны да холаду. Не рэкамендуецца насіць металічныя ўпрыгажэнні, бо метал адводзіць цяпло значна хутчэй.

## Извещение об открытом аукционе по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Гродно 18 февраля 2025 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб. | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Гродненская область, г. Гродно, ул. Рубиновая, 1, У-50, микрорайон «Барановичи-7», 440100000003005968** | 0,1015 | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, готовность: 12 %. Площадь застройки: 129 кв. м, фундамент: фундаментные блоки. Земельный участок расположен в охранных зонах электрических сетей (0,0034 га) | 29 840,02 (10 159,17; 19 680,85) | 363,14 | 5 900,00 |
| 2 | **Гродненская область, г. Гродно, ул. Ивана Мележа, 1, У-247, микрорайон «Барановичи 5, 6», 440100000003005034** | 0,0970 | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение. Наружная площадь (площадь застройки): 180 (180) кв. м, степень готовности: 10 %. Фундамент: бетон | 27 565,95 (8 757,65; 18 808,30) | 361,10 | 5 500,00 |

Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр. и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок с момента подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома в установленный срок. Победитель аукциона обязан в течение срока строительства возместить затраты на инженерную и транспортную инфраструктуру согласно индивидуально разработанному проекту в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 и решением Гродненского городского исполнительного комитета от 12.04.2022 г. № 260.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», телефоны: +375 (152) 626055, 626056.

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400, ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, код назначения платежа 40901, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Аукцион состоится 18 февраля 2025 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

**Прием документов, консультации и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 20 января по 12 февраля 2025 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.



НЕФАРМАТ

# КАЛІ ГЕРОІ ПОБАЧ

**Не бачу ніякай нагоды парушаць традыцыю, і першую сваю калонку ў новым годзе прысвячаю маім героям. Сёння ўспомню некалькі незабыўных сустрэч 2024 года, згадаю тых, хто не проста пакінуў светлы след у душы, але ўмацаваў веру ў людзей.**

Першая такая сустрэча адбылася ў студзені мінулага года. Валянціна Андрэеўна Ігнацюк жыве ў Кобрыне, здзівіла тым, што ў 92 гады сама водзіць машыну. «Хадзіць мне цяжка, — гаварыла жанчына, — а за рулём сябе адчуваю як рыба ў вадзе». Жыве цяпер адна, але адзінокай сябе не лічыць, актыўна камунікуе з роднымі і знаёмымі. Валянціна Андрэеўна ледзь не палову жыцця змагалася за аднаўленне гістарычнай праўды адной асобна ўзятай сям'і, сваёй сям'і. І дабілася свайго. Прозвішча яе дзеда і таго вайскоўца, якога дзед ратаваў у вайну і з-за якога загінуў, накрэслілі на абелісках. Такім чынам унучка праз многа гадоў вярнула памяць пра дзеда.

Ёй было дзевяць гадоў, але яна памятае, як у адзін з першых дзён вайны праз іх вёску ішлі вайскоўцы з боку Брэста на ўсход. Адзін зусім маладзенькі, паранены, знясілены ўпаў. Было відавочна, што ён нікуды не дойдзе. Яе дзед, Улас Біч, падабраў хлопца, адвёз на свой хутар. Яны з бабуляй вылечылі Ігната Марозава і пакінулі ў сябе. Хлопец дапамагаў па гаспадарцы, дзед выдаваў Ігната за свайго пляменніка з Расіі. Але ж знайшоўся злыдзень, данёс. У 1942 годзе прыехалі паліцаі і забралі Марозава. А на трэці дзень дзед запрог каня і паехаў у Кобрын ва ўправу, думаў выручыць яго, але і сам не вярнуўся. Жонка, дочкі Уласа сталі асцярожна распытваць відавочцаў і высветлілі, што Ігната і Уласа расстралялі з іншымі вязнямі турмы — яўрэйскімі сем'ямі — на пустцы, у раёне цяперашняй другой школы. Пазней на гэтым месцы з'явіўся абеліск з прозвішчамі бязвінных ахвяраў, а ў канцы спіса стаяла... «і два невядомыя».

Валянціна на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў шукала сведак, дакументы, звярталася ў розныя інстанцыі, пакуль гістарычная праўда не была адноўлена. Дарэчы, знайшліся сляды Ігната Марозава, лётчыка, які столькі часу лічыўся прапаўшым без вестак. І год таму на абноўленым абеліску з'явіліся прозвішчы невядомых дагэтуль герояў вайны. Імя земляка, якога катавалі ў кобрынскай турме, а затым расстралялі, накрэслілі і на помніку ў Чаравачыцах, на радзіме Уласа Біча. Валянціна Андрэеўна прыходзіць сюды з сястрой і прадстаўнікамі малодшых пакаленняў сям'і. Іншая на яе месцы апусціла б рукі, адступілася, а яна палічыла, што гэта яе абавязак перад памяццю пра вайну.

Дзеля памяці жывуць і бацькі Дзмітрыя Гвішыяні, героя нашага часу. Летась споўнілася чвэрць стагоддзя з дня яго подзвігу. Курсант Ваеннай акадэміі ехаў у цягніку на заняткі, ноччу ў саставе загарэўся цеплавоз. Яны з таварышамі спачатку выводзілі людзей, а потым Дзіма бясстрашна кінуўся тушыць пажар. Але выбухнуў паліўны бак, хлопца абдало саляркай, ён атрымаў апёкі 65 % паверхні цела і праз тры дні памёр у мінскім шпіталі. Бацька Барыс Гвішыяні расказваў аўтару гэтых радкоў, як, седзячы каля ложка сына, у роспачы спытаў: «Чаго ты пайшоў у самае пекла!?» А ён у адказ: «А хто пойдзе, іншыя ж не пайшлі». «І цяпер думаю, у вагонах былі мужчыны, старэйшыя за нашых дзяцей, але ж не кожны адважыцца кінуцца туды, дзе агонь,» — разважаў Барыс Рыгоравіч.

Ну і потым, праз нейкі час многія задавалі рытарычнае пытанне бацьку: «Чаму апошні ахвярны крок зрабіў яго сын, гэты зусім яшчэ юны чалавек?» Што тут скажаш? Ён пайшоў, прыкрываючы пасажыраў, не зважаючы на перасцярогу чыгуначнікаў, што там вельмі небяспечна. Ён зрабіў усё правільна — такі вердыкт вынесла камісія Міністэрства абароны, якая расследавала здарэнне. А бацька, калі праводзілі сына, скажа: «Мы з маці не гадавалі сына героем, мы выхоўвалі чалавека, мужчыну».

Пасля гібелі сына Марал і Барыс Гвішыяні вучыліся жыць наноў. І цяпер на свеце іх трымае памяць пра яго, яны прыходзяць да вучняў 30-й брэсцкай школы, якая носіць імя Дзмітрыя, бываюць у Ваеннай акадэміі, наведваюць мерапрыемствы ў гонар іх сына. І гэта — іх чалавечы подзвіг.

Часам подзвігам становіцца само жыццё. Ну як у Яўгеніі Дульскай са Столінскага раёна. Яна не так даўно атрымала ўзнагароду на адным з конкурсаў прыгажосці ў Расіі. Яўгенія займаецца сацыяльна значнымі праектамі. Яна — шматдзетная маці. «Ну і што тут асаблівага?» — нехта спытае. Асабліва тое, што Жэня не ходзіць, яна рухаецца з дапамогай інваліднага вазка. Але ж працуе, гадуе дзяцей. А жыве ярка і цікава дзякуючы вялікай духоўнай сіле і штодзённай рабоце над сабой.

Справу служэння сям'і некалі назваў мацярынскім подзвігам уладыка Філарэт. Выказванне згадалася мне пры размове з Таццянай Арэхавай, маладой жанчынай, маці шасці дзяцей. Яна здолела напоўніць жыццё сваёй сям'і любоўю, пазітывам, узаемапавагай. Дзеці добра вучацца, займаюцца музыкай, растуць памочнікамі. А гэта — нямала.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**Капланецкий сельский исполнительный комитет** извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Матевичи, ул. Борисовская, д. 30 (адрес указан согласно похозяйственной книге), имеющий основания для признания его пустующим.**

**Сведения о жилом доме (из акта)**

Наружные размеры одноквартирного, жилого дома: 6 х 10 м.

Площадь: 60,0 кв. м.

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1954 года постройки.

Материал стен: деревянный.

Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Одноквартирный жилой дом грозит обвалом.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): собственник – Шмарловский Владимир Иванович (умер 08.11.2010 г.), наследник – Шмарловский Иван Владимирович (умер 01.06.2014 г.).

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 10 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Капланецкий сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Капланецкий сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Капланецкий сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

**Телефоны для справок: 801715 62 3 32, 801715 62 3 33.**

УНП 600092462

## О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**Березинского района Минской области**
**д. Матевичи, ул. Борисовская, д. 30**

Капланецкий сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом по адресу: Минская область, Березинский район, д. Матевичи, ул. Борисовская, д. 30 (полный адрес указан согласно похозяйственной книге). Собственник – Шмарловский Владимир Иванович (умер 08.11.2010 г.), наследник – Шмарловский Иван Владимирович (умер 01.06.2014 г.).

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания, сообщить в Капланецкий сельисполком по телефонам: **8 01715 62332, 801715 62333 (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням).**

Также информацию можно прислать по адресу: **223306, Минская область, Березинский район, д. Капланцы, ул. Погостская, 2.**

УНП 600092462

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**Капланецкий сельский исполнительный комитет** извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Матевичи, ул. Борисовская, д. 18 (адрес указан согласно похозяйственной книге), имеющий основания для признания его пустующим.**

**Сведения о жилом доме (из акта)**

Наружные размеры одноквартирного, жилого дома: 6 х 9 м.

Площадь: 52,0 кв. м.

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1949 года постройки.

Материал стен: деревянный.

Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Одноквартирный жилой дом находится в аварийном состоянии.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): собственник – Поддубский Василий Исакович (умер 01.06.2008 г.).

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 10 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Капланецкий сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Капланецкий сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Капланецкий сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

**Телефоны для справок: 801715 62 3 32, 801715 62 3 33.**

УНП 600092462

## О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**Березинского района Минской области**
**д. Матевичи, ул. Борисовская, д. 18**

Капланецкий сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом по адресу: Минская область, Березинский район, д. Матевичи, ул. Борисовская, д. 18 (полный адрес указан согласно похозяйственной книге). Собственник – Поддубский Василий Исакович, умер 01.06.2008 г.

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания, сообщить в Капланецкий сельисполком по телефонам: **8 01715 62332, 801715 62333 (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням).**

Также информацию можно прислать по адресу: **223306, Минская область, Березинский район, д. Капланцы, ул. Погостская, 2.**

УНП 600092462

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже движимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов **2025.Г.002.00020** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** Комитет государственного имущества Витебского областного исполнительного комитета, 210029, г. Витебск, ул. Правды, 38, тел. 8 (0212) 65 35 88.

**Организатор, оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY**: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 31.01.2025 в 9.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).**

### Лот № 1. Автомобиль легковой GEELY SC7,

2014 года выпуска, тип – легковой седан, рег. знак 0041 АВ-2, номер кузова: Y4K8844S0EB003011, цвет – серебристый металлик, инв. № 01510006.

**Начальная цена:** 4600,00 бел. руб. без учета НДС.

**Задаток: 460,00 бел. руб.**

**Местонахождение предмета электронных торгов:** г. Витебск, ул. Правды, 38.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением «О порядке проведения электронных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608, и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 31.01.2025.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**Капланецкий сельский исполнительный комитет** извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Матевичи, ул. Партизанская, д. 11 (адрес указан согласно похозяйственной книге), имеющий основания для признания его пустующим.**

**Сведения о жилом доме (из акта)**

Наружные размеры одноквартирного, жилого дома: 6 х 10.

Площадь: 62,0 кв. м.

Материал стен: бревенчатый.

Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): собственник – Лычковская Анна Васильевна (умерла 25.09.2021 г.).

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 5 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Капланецкий сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Капланецкий сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Капланецкий сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

**Телефоны для справок: 801715 62 3 32, 801715 62 3 33.**

УНП 600092462

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**Капланецкий сельский исполнительный комитет** извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Матевичи, ул. Партизанская, д. 39 (адрес указан согласно похозяйственной книге), имеющий основания для признания его пустующим.**

**Сведения о жилом доме (из акта)**

Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 4 х 10 м.

Площадь: 38,3 кв. м.

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1934 года постройки.

Материал стен: деревянный.

Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): собственник – Измер Елена Ивановна, умерла 09.03.2013 г.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 10 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Капланецкий сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Капланецкий сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Капланецкий сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

**Телефоны для справок: 801715 62 3 32 , 801715 62 3 33.**

УНП 600092462

# КРОК ДА СТАРАЖЫТНАГА ГАНЧАРСТВА

## У Свіслачы адраджаюць тэхналогію чорназадымленай керамікі — элемента нематэрыяльнай культурнай спадчыны



**Справу сваіх знакамітых землякоў працягвае Яўген МАЦЯШУК — майстар мастацкіх промыслаў аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры Свіслацкага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці. Яго работы дэманструюцца ў мясцовым музеі, а сам ганчар — пастаянны ўдзельнік шматлікіх кірмашоў і фестываляў. Майстар робіць гліняны посуд у традыцыйным народным стылі і марыць разам з формай аваладаць старажытнай тэхналогіяй чорназадымленай керамікі. Для гэтага ў Свіслачы плануюць закупіць адпаведны горн, якім карысталіся ганчары для дасягнення эфекту «чорнай» гліны.**

У аддзеле рамёстваў цэлая лінейка экспанатаў Яўгена Мацешука. Іх тут некалькі дзясяткаў розных памераў і формаў. Разнастайны посуд у асноўным мае тэракотавы колер, але ёсць і больш цёмныя вырабы.

— Новая калекцыя цікавая тым, што ў ёй з'явіліся элементы даўнішняй тэхналогіі глянцавання. Такім чынам, мы рухаемся ў бок чорназадымленай керамікі, якую рабілі некалі поразаўскія майстры. Пакуль такога эфекту дасягнуць не ўдаецца, але ўжо з'явіліся на вырабах характэрныя штрыхі, якія рабілі даўней. Яны ствараюцца толькі прыроднымі каменьчыкамі, пасля чаго застаецца характэрны след. А называюцца яны ў ганчароў «грамушкамі», — раскрывае Яўген асаблівасці свайго промыслу.

Суразмоўнік невыпадкова прыгадаў поразаўскіх майстроў. Менавіта яны прынеслі славу ўсяму наваколлю сваёй незвычайнай тэхналогіяй. У гарадскім пасёлку Поразава непадалёку ад Свіслачы з даўніх часоў пачало развівацца ганчарства. У канцы XIX стагоддзя з 600 жыхароў каля 200 чалавек былі майстрамі-керамістамі. Амаль у кожным двары рабілі гліняны посуд.

Ганчарнае рамяство перадавалі з пакалення ў пакаленне. Такіх дынастый у Поразаве быў не адзін дзясятак: Пінюты, Козікі, Раманоўскія, Шалкевічы, Паплаўскія, Перашчакі... Сям'я Шопікаў — адна з самых знакамітых. Іосіф Шопік пераймаў сваё майстэрства ад бацькі Іосіфа, той ад свайго. Такім чынам, прайшоўшы праз пакаленні, звычайнае рамяство дасягнула высокага мастацкага ўзроўню. Дарэчы, калекцыя поразаўскіх майстроў ёсць і ў Свіслацкім аддзеле рамёстваў.

Яўген прыгадаў, што і яго настаўнік з роду знакамітых ганчароў.

— А пачалася мая ганчарная адукацыя з таго, як правільна падрыхтаваць гліну, бо гаршчок можа з'явіцца на коле і праз 15 хвілін, а вось каб прыгатаваць кавалак гліны пэўнай вагі, патрабуецца больш часу. Тут трэба прыбраць усе бурбалкі, так званыя паветраныя мяшкі. У Беларусі два даступныя нам віды гліны — белая і чырвоная. Мы яе купляем у здабытчыкаў. На заводзе гліну фільтруюць пад ціскам, у спецыяльнай тканіне — рукамі такое зрабіць амаль немагчыма. Брак можа праявіцца і праз некалькі тыдняў, — расказвае Яўген. — Пры абпальванні яна набывае колер тэракоту. Прымяняецца і малочнае абпальванне, калі выраб апускаецца ў малака. Пасля малочнага абпальвання ён цямнее, больш трывалы, не намакае. А вось каб дасягнуць чорнага колеру, гліняныя вырабы абпальваюць у спецыяльных печах на дровах.У электрычных печах такога эфекту не атрымаць, але мы рухаемся ў гэтым кірунку.



Каб кераміка атрымала чорны колер, старажытныя майстры ўстанаўлівалі спецыяльныя горны, якія будавалі на вуліцы. Вырабы пасля абпальвання ставілі ў асобную камеру, засыпалі горн зямлёй, каб стварыць атмасферу печы. Кісларод выгараў і заставаўся газ CO (угарны газ). Ён уступаў у сувязь з аксідамі жалеза, якія знаходзяцца ў гліне, і атрымоўвалася чорная афарбоўка. У канцы XIX — пачатку XX стагоддзя пасёлак Поразава лічыўся адным з галоўных цэнтраў чорнай керамікі.

— Гэта кераміка ўключана ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі, і мы ўжо набліжаемся да такіх вырабаў. Цяпер вядзецца работа над тым, каб набыць такі горн. Ён будзе размяшчацца на нашай пляцоўцы на вуліцы, — тлумачыць субяседнік.

Сам Яўген па адукацыі лепшчык і рэстаўратар ляпніны, але ўзяўшы раз у рукі гліну, не змог ад яе адарвацца. Цяпер ён пастаянны ўдзельнік розных выставак і кірмашоў. Кажа, што інтарэс да ганчарных вырабаў расце, імі цікавяцца як месцічы, так і турысты, якія часта сюды прыязджаюць. Многія набываюць кубкі, але не толькі. Па словах майстра, цяпер у трэндзе гаршчочкі для запякання, куды можна пакласці і мяса, і бульбу, і розную агародніну.

Увогуле былыя майстры рабілі з гліны ўвесь кухонны посуд: гаршкі, патэльні, макацёры, бабачнікі (для бабкі), друшлякі, міскі, кубкі, чайнікі, маслёнкі, пітушкі, шклянкі, жбаны, флякі, гарлачыкі, спарышы. З іншых прадметаў — рукамыйнікі, букетнікі, вазоны, цацкі.

— Я заўсёды гляджу на вырабы старых майстроў і лічу, што гэта бясконцая крыніца для творчасці. Штосьці мяняем, уносім элементы сучаснасці, і, тым не менш, народная крыніца — гэта наша натхненне, — кажа ганчар. — Дарэчы, і нашым посудам таксама можна карыстацца. Сёння дабавілася і дэкаратыўная асаблівасць, калі вырабы часта ўпрыгожваюць інтэр'ер і надаюць каларыт жытлу.

У Свіслацкім цэнтры культуры і народнай творчасці будучае развіццё ганчарства звязваюць менавіта з адраджэннем чорназадымленай керамікі. Тады можна будзе рабіць рэчы не горш, чым поразаўскія майстры. Цяпер гэтых вырабаў засталося няшмат. Некаторых відаў наогул адзінкі. Іх свіслацкі майстар увасабляе толькі па фотаздымках. Па словах суразмоўніка, вяртанне да традыцый дазволіць значна ўзбагаціць турыстычны патэнцыял Свіслацкага раёна.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**


**ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Лепельпромшвеймебель»**

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1819 | Капитальное строение с инвентарным номером 230/С-15134 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – компрессорная, общая площадь – 33,0 кв. м). Оборудование: трансформатор ТМГ-400/10 – 2 шт. | Витебская область, Лепельский район, г. Лепель, ул. Володарского, 1 | 26190,00 | 2619,00 | 1309,50 |
| 1820 | Капитальное строение с инвентарным номером 230/С-8896 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – пилорама, общая площадь – 530,2 кв. м). Оборудование: пилорама Р-6-4 | Витебская область, Лепельский район, г. Лепель, ул. Володарского, 1 | 28530,00 | 2853,00 | 1426,50 |
| 1842 | Капитальное строение с инвентарным номером 230/С-15135 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – котельная, общая площадь – 207,0 кв. м); насос ТОПС 50/15, инв. 679; насос в котельной, инв. 509; насос ИРЛ 65/115-1,5 12, инв. 690 | Витебская область, Лепельский район, г. Лепель, ул. Володарского, 1 | 25657,56 | 2565,76 | 1282,88 |
| **Лот** | **Наименование** | | **Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.** | **Задаток, бел. руб.** | **Шаг аукциона, бел. руб.** |
| 1843 | Геран Люкс ПГУ-1-100, инв. 949; Геран ПГУ-1-300, инв. 950; Геран ПГУ-С-153. инв. 951 | | 2 764,80 | 276,48 | 138,24 |
| 1844 | Парогенератор Gold Eagle DL-7, инв. 952; стол Gold Eagle DL-1068 | | 712,80 | 71,28 | 35,64 |
| 1846 | Плоттер JETLINK-180 N, инв. 923 | | 216,00 | 21,60 | 10,80 |

В отношении лотов №№ 1819, 1820 проводятся вторые повторные торги. **Стоимость снижена на 25 %.** В отношении лотов №№ 1842-1844, 1846 проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 239 (30373) от 07.12.2024, стр. 11

Местонахождение лотов №№ 1843, 1844, 1846: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Володарского, 1

| | |
|---|---|
| **Земельный участок** | Лоты №№ 1819, 1820, 1842 расположены на земельном участке с кадастровым номером 241200000001000283, площадью 0,9829, назначение – земельный участок под производственную базу. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: зем. участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в охранной зоне реки, водоема), код – 2,4, площадь – 0,9829 га. На часть земельного участка имеется сервитут |
| **Дата и время проведения торгов** | **29 января 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **С 10.00 16 января 2025 года до 16.00 27 января 2025 года** |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту ___, ОАО «Лепельпромшвеймебель», проводимых 29.01.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.
**Вознаграждение аукциониста: по лотам №№ 1819, 1820, 1842 – 7 %, по лоту № 1843 – 9 %, по лотам №№ 1844, 1846 – 10 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать (заключить) с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней (по лотам №№ 1843, 1844, 1846) и в течение 20 (двадцати) рабочих дней (по лотам №№ 1819, 1820, 1842) со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 5 (пяти) рабочих дней (по лотам №№ 1843, 1844, 1846) и не позднее 30 календарных дней (по лотам №№ 1819, 1820, 1842) со дня заключения договора.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Ирина Сигизмундовна, +375298903354. Дополнительная информация по предмету торгов по тел. +375293058650, Алена.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Лепельпромшвеймебель» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: 8 (017) 255-29-28, 8 (029) 304-59-90; e-mail: kp@p-k.by (211180, Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Володарского, д. 1, УНП 300038815)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

# Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ.

Ужо які год цэнтральнае месца ў кветкавых калекцыях займаюць расліны з буйным лісцем. І іх папулярнасць толькі расце. Яны ўпрыгожаць сваім раскошным відам кожны інтэр'ер: і як салісты, і ў групе з іншымі відамі. Дапамогуць размежаваць зоны ў пакоі і ажывяць пусты кут. Таму, калі ў вас дазваляе месца, можна смела заводзіць «вялікамеры».

## ДОГЛЯД БУЙНАЛІСТЫХ РАСЛІН У ХАТНІХ УМОВАХ

### АЛАКАЗІЯ



Трапіканцы супрацьпаказаны нізкія тэмпературы і халодныя скразнякі. Расліна не любіць сухога паветра і прамых сонечных прамянёў. Аптымальнае месца — на ўсходніх і заходніх падаконніках.

Паліваюць алаказію, не дапускаючы застою вільгаці і перасушкі землянога кома.

### ДЫФЕНБАХІЯ



Каб расліна адчувала сябе камфортна, неабходна выбраць для яе светлае і цёплае (не ніжэй +18–23 °C) без скразнякоў месца. Пры нізкіх тэмпературах запавольваецца рост і яна становіцца ўразлівай для хвароб і шкоднікаў. Асабліва небяспечнае пераахаладжэнне каранёў.

Дыфенбахіі патрэбна лёгкае зацяненне. Пры недахопе святла яна выцягваецца, ліст драбнее, ствол фарміруецца тонкі, скрыўляецца і хутка агаляецца.

Расліна можа прыстасавацца да нізкай вільготнасці паветра.

### МАНСТЭРА далікатная (прывабная)



Расліна не пераносіць вільгаці і холаду (тэмпература павінна быць не ніжэй за +18 °C). Выбірайце цёплае месца з яркім рассеяным святлом, хоць манстэра ценевынослівая (стракалістыя формы больш патрабавальныя да асвятлення). Таксама яна добра пераносіць нізкую вільготнасці паветра. Узімку трымайце расліну далей ад батарэй і беражыце ад скразнякоў. Для павышэння вільготнасці апырсквайце лепш лісце, а паветраныя карані.

Буйныя расліны можна перасаджваць раз у пяць гадоў, штогод змяняючы верхні пласт грунту на свежы і мульчыруючы паверхню субстрату сфагнумам.

### СТРЭЛІЦЫЯ МІКАЛАЯ



Цвіце ў студзені-лютым. Для закладкі бутонаў неабходны перыяд спакою ў лістападзе—снежні пры 14—16° С. У гэты час паліў скарачаюць, даючы грунту амаль цалкам прасохнуць, і не падкормліваюць.

Перад цвіценнем тэмпературу ўтрымання паступова паднімаюць да 22 °C і аднаўляюць паліў — без перасушкі і пераўвільгатнення.

### ФІЛАДЭНДРАН

Баіцца прамых сонечных прамянёў, таму лепш паставіць бліжэй да акна ці нават у глыбіні пакоя, можна побач з крыніцай штучнага святла.

Аптымальная тэмпература вырошчвання — +16—25 °C, (не ніжэй за +12 °C).

Узімку паліў трэба абмежаваць, але не дапушчаць поўнага перасыхання грунту.



Пры занадта сухім паветры на кончыках і баках пласцінак з'яўляюцца карычневыя плямы, лісце пачынае ападаць. Ад недахопу святла яно драбнее і становіцца больш бляклым.

### КАЛАТЭЯ ўпрыгожаная (арната)



Аддае перавагу яркаму рассеянаму святлу. Пры недахопе асвятлення ліст драбнее, расліна выцягваецца і губляе яркасць афарбоўкі, краі пласцінак чарнеюць, ніжнія лісты хутчэй адміраюць. Зімой лепш дасвечваць.

Калатэя цеплалюбівая. Пры тэмпературы ніжэй за +15 °C спыняе рост, а пры +10 °C дробныя карэньчыкі, якія ўсмоктваюць ваду, перастаюць функцыянаваць і паступова адміраюць, лісце жоўкне і ападае. На халодным падаконніку пакладзіце пад вазон драўляную, коркавую, або пенапластавую падстаўку.

Ад сухога паветра падсыхаюць кончыкі і краі лісця, таму трэба павышаць яго вільготнасць: апырскваць прастору вакол, ставіць расліну на паддон з вільготным керамзітам, выкарыстоўваць пакаёвыя фантанчыкі, спецыяльныя прыборы і г. д.






Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

## АЛЁ, НАРОД!..

ВЯСЁЛЫЯ І ЦІКАВЫЯ ГІСТОРЫІ АД ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

Вядучая рубрыкі Валянціна ДОЎНАР.

### ВЕРУ!.. ЛЮБОМУ ЗВЕРУ?

**Гэту гісторыю я пачуў ад сваёй знаёмай гадоў колькі таму. Далей — з яе слоў, як запомніў.**

— У пяцідзясятыя гады мінулага стагоддзя нашу сельгасарцель аб'ядналі з суседнімі — утварылі вялікі калгас, прыслалі два трактары для апрацоўкі зямель і — адпаведна — двух трактарыстаў. Адзін быў дзядзька ў гадах, другі — малады нежанаты хлопец. Я таксама была маладой, невялічкай, сарамлівай, працавала ў паляводстве «старшай, куды пашлюць».

Але ж Вася-Васілёк (так звалі трактарыста) чамусьці звярнуў на мяне ўвагу: стаў запрашаць на танцы, праводзіць дамоў. Нам заўсёды было аб чым пагаварыць, мы сталі з паўслова разумець адно аднаго і па восені справілі вяселле.

Жылі спачатку ў ягоных бацькоў, пакрысе абжываліся, будаваліся, знаходзілі новых сяброў і сяброўак. У мяне іх было аж дзве. Надзя рана выйшла замуж і рана аўдавела: муж разбіўся на машыне. Так што яна адна гадавала дачку, цягнула дом і гаспадарку... Не хапала там дужых мужчынскіх рук, і мой Васіль калі-нікалі дапамагаў ёй: то дровы прывезці, то бульбу пасадзіць... Я нічога не мела супраць.

А з Яней мы разам працавалі на ферме. Замужам яна не была. І мяне, як часам здавалася, хацела ці не развесці — пасварыць з Васілём. Для гэтага ўсё часцей намякала, што з Надзеяй ён не проста так, што там шуры-муры...

Я не хацела ёй верыць, моўчкі спраўлялася з рэўнасцю, але ж неяк...

Тады ўжо бралася пад восень. Мы на ферме закончылі дойку. Яня была выхадная. А тут раптам з'яўляецца, адводзіць мяне ўбок.

— Ты ўсё не верыш, — шэпча на вуха, — а твой, як толькі сцямнела, — шусь да Надзі ў хату... І святло патушыў...

Не ведаю, што тады са мною зрабілася: выскачыла на двор, схапіла лейцы (падвозчыкі не паспелі вупраж прыбраць), панеслася да Надзеі.

Святла ў яе вокнах сапраўды не было, дзверы не зачынены... Агеньчык цыгаркі на ложку.

Я да яго і лейцамі, лейцамі... Па абаіх.

Мужчына першым ускочыў і ў дзверы... Я за ім... І лупіла ўжо, як магла! Найболей — ля плота: ён «затармазіў», пакуль пераскочыў, а я там прыпынілася.

Стаю і думаю: раней нават слова благога мне муж не казаў (не тое каб руку падняць), а што ж будзе цяпер? Трэба дадому ісці і ногі не нясуць! Баюся...

Але ж прыцягнулася неяк, дзверы адчыняю і вачам не веру: Вася мой... дома з сынам гуляе. Убачыў мяне і спужаўся. Пытаецца:

— Што з табой? Захварэла?

А я і адказаць не магу: раву — як тое дзіця — чым далей, тым гучней, бо і радасна мне, і сорамна, і смешна, і цікава, кага ж гэта я так адхадзіла?!

...У вёсцы, кажуць, нічога не схаваеш, але гэтым разам неяк пранесла: ніхто нічога не чуў, не бачыў: «восень, на вуліцы цёмна»...

**Іван Букоўскі,**

*Глыбоцкі р-н.*

## 16 СТУДЗЕНЯ Даты Падзеі Людзі

У краіне

**1885** год — нарадзіўся (в. Перажыр, цяпер у Пухавіцкім раёне) Аляксей Васільевіч Бягун, удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Беларусі. У рэвалюцыю 1905—1907 гадоў кіраваў сялянскімі выступленнямі ў Ігуменскім павеце. У 1906-м арыштаваны і сасланы ў Архангельскую губерню, адкуль збег. Эміграваў у ЗША, быў членам Амерыканскай сацыялістычнай партыі, затым Кампартыі ЗША, дэлегат яе I з'езду (1919). Пасля Грамадзянскай вайны вярнуўся на радзіму. Працаваў на партыйнай і гаспадарчай рабоце ў Мінскай і Магілёўскай абласцях.

**1905** год — нарадзіўся Алесь Пальчэўскі (в. Прусінава, цяпер Уздзенскі раён), беларускі пісьменнік. Першыя яго вершы і апавяданні былі надрукаваны ў 1925 годзе. Працаваў у газеце «Зорька», быў рэдактарам у Дзяржвыдавецтве БССР, адказным сакратаром часопіса «Вясёлка».



**1919** год — нарадзіўся (г. Бабруйск) Уладзімір Алоўнікаў, беларускі кампазітар. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Народны артыст Беларусі. Прафесар. У. Алоўнікаў — аўтар кантаты і араторыі, сімфанічных паэм, харавой і камерна-інструментальнай музыкі. Асаблівае месца ў яго творчасці займаюць песні. Пачатковы матыў адной з іх — «Радзіма, мая дарагая» — стаў пазыўнымі Беларускага радыё.

У свеце

**1920** год — у ЗША пачаў дзейнічаць «сухі закон», агульнанацыянальная забарона на продаж, вытворчасць і транспарціроўку алкаголю, які дзейнічаў на федэральным узроўні з 1920 да 1933 года. Уведзены Васемнаццатай папраўкай да Канстытуцыі ЗША і канкрэтызаваны «законам Волстэда».

**1989** год — выдадзены Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб дадатковых мерах па аднаўленні справядлівасці ў дачыненні да ахвяр рэпрэсій, якія мелі месца ў перыяд 30—40-х і пачатку 50-х гадоў», якім былі адменены ўсе прысуды, вынесеныя ў пазасудовым парадку (сумна вядомымі «тройкамі» і органамі НКУС).

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 781. Індэкс 63850. Зак. № 81.

Нумар падпісаны ў 19.30 15 студзеня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12